ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА ПА НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНЫМ ЗАБЕСПЯЧЭННІ ЎСТАНОЎ АДУКАЦЫІ ГОРАДА МАГІЛЁВА



## *Паэтычны зборнік*

# *“Спроба пяра”*

**Выпуск 3**

**Магілёў 2021**

*Паважаныя сябры!*

*Сёння мы знаёмім вас з творчымі работамі вучняў, якія прымалі ўдзел у гарадскім конкурсе юных паэтаў “Спроба пяра”. Правядзенне дадзенага конкурсу стала традыцыйным. І вось перад вамі ўжо трэці зборнік вершаў.*

*Юныя паэты пішуць аб тым, што іх хвалюе, аб чым яны перажываюць. Літаратурныя работы раскрываюць унутраны свет аўтараў, іх жыццёвую пазіцыю, разуменне акаляючага свету. Іх творы паказваюць, што ў якім стагоддзі мы б ні жылі, ідэі дабра, справядлівасці, любові, беражлівых адносін да ўсяго акаляючага застаюцца для дзяцей важнымі этычнымі паняццямі. Сучасная моладзь гатова ствараць штосьці новае, добрае, светлае. Інакш сярод гэтых работ не было б столькі цудоўнага, напісанага ад душы, ад сэрца.*

*Работы прадстаўлены па намінацыях “Славутыя імёны Беларусі”, “Беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя”, “Магілёў і Магілёўшчына”, “Беларуская мова”, “Вершы на вольную тэму”. У тэкстах захаваны арфаграфія і пунктуацыя аўтараў.*

*Жадаем вам прыемных хвілін чытання!*

*Дзяржаўная ўстанова*
*па навукова-метадычным забеспячэнні ўстаноў*
*адукацыі горада Магілёва*

dreamstime.

# *Змест*

## *Намінацыя “Славутыя імёны Беларусі”*


1. Башарымава Маргарыта Аляксееўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Я люблю Караткевіча творы*** …….6
2. Сафонава Сняжана Сяргееўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Акраверш “У нашага народа ёсць Паэт***……..7
3. Стальмашок Юлія Алегаўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Ганаруся***………………………………………..8
4. Аношка Ксенія Юр’еўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 2 г. Магілёва” ***У Ляўках***.........................................................9
5. Маркава Ганна Уладзіміраўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Чытаючы Уладзіміра Караткевіча*** …10
6. Сушко Вольга Аляксееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Рыгору Барадуліну***………………………………11
7. Крылова Марыя Дзмітрыеўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва” ***Караткевічу***……………………...................13
8. Кубракова Віялета Сяргееўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Уладзіміру Караткевічу***……………14
9. Ларчанка Паліна Сяргееўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Пад зоркай Караткевіча***……………………..15
10. Зямлінская Паліна Дзянісаўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва” ***Паэту***……………………………………………17
11. Івуцін Іван Яўгенавіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Мой Уладзімір Караткевіч***……………………...........18


## *Намінацыя “Беражлівыя адносіны да навакольнага асяроддзя”*


1. Клачкова Маргарыта Дзмітрыеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Асалода для вачэй***………………….20
2. Сенакосава Вера Аляксандраўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Пабывайце летам у лесе***……………21
3. Сомава Ганна Сяргееўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Няхай планета будзе свабодна!***..................................22
4. Галайда Аляксандра Алегаўна, вучаніца XI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Успамін***……………………………………………23
5. Другакоў Яраслаў Аляксандравіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Радзіма пачынаецца***………………..24
6. Жуйкова Соф’я Паўлаўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Беражы прыроду***………………………………..25
7. Біндасава Марыя Андрэеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва” ***Лясы Беларусі***………………………………….26
8. Аўдашкін Глеб Паўлавіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Беларускі лес***…………………………………….27
9. Бурчанка Яраслаў Дзмітрыевіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Стамілася надвор’е***…………………………………….28
10. Розанцава Соф’я Антонаўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Калісьці чуў я на сяле*** ………………………..29

## *Намінацыя “Магілёў і Магілёўшчына”*


1. Сілкоў Рустам Віктаравіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Любы мой горад***....................................................30
2. Масейкіна Анастасія Русланаўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Горад сэрца майго***……………………31
3. Караткевіч Цімафей Антонавіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Буйніцкае поле***……………………………………32
4. Халаімава Дзіяна Уладзіміраўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Горад мой***………………………………33
5. Касілава Аляксандра Валер’еўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***У чэрвені 44-га***…………………………35
6. Музычэнка Марат Генадзьевіч, вучань IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва” ***Родны горад***……………………………………..36
7. Стралкоўская Дар'я Антонаўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 41 г. Магілёва” ***Мая малая радзіма***…………………………...37
8. Стагначоў Багдан Мікалаевіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Мой горад***…………………………………………………38
9. Казакоў Даніл Віктаравіч, вучань IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва” ***Абяцанне роднаму гораду***………………………40
10. Пілецкі Іван Алегавіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Наш родны горад***…………………………………41
11. Акуленка Ульяна Максімаўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***Заасад***……..........................................................42
12. Несцерава Марыя Алегаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “ВНП дзіцячы сад - сярэдняя школа № 42 г. Магілёва” ***Магілёў***................................43
13. Аніськова Анастасія Вячаславаўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Горад на Дняпры***……...................................44
14. Брытаў Уладзіслаў Аляксандравіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Маленькая Радзіма***..........................46


## *Намінацыя “Беларуская мова”*


1. Дзядзюля Аліна Уладзіміраўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва ***Мова жыцця***……………………………47
2. Церахава Маргарыта Паўлаўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Адзіная мая***……………………........................48
3. Самкова Дар’я Аляксееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва” ***Роздум пра родную мову***……………………...50
4. Волкава Аліна Васільеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 38 г. Магілёва” ***Родная мова***………………..........................52
5. Шынкарэнка Маргарыта Сяргееўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва” ***Беларуская мова***………………………53
6. Раманенка Паліна Андрэеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 2 г. Магілёва” ***Што гэта такое роднае слова?***………………………....54
7. Вароніна Ганна Сяргееўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 22 г. Магілёва” ***Наша мова не загіне!***…………………………...55
8. Майстрова Ніна Андрэеўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Слова пра мову***..........................................................56
9. Веранёва Вераніка Уладзіміраўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Наша мова***……………………………..57

*Намінацыя “Вершы на вольную тэму”*


1. Шайкова Юлія Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Бабулечка мая***……………………….............59
2. Баранкова Дзіяна Андрэеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Мая вёска***……...............................................60
3. Старыкава Марыя Паўлаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва” ***Слова аб настаўніку***.....................................62
4. Волкаў Мікалай Аляксандравіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Мы любім край наш дарагі!***...........................63
5. Каліна Аліна Алегаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Наша Беларусь***……....................................64
6. Сіманенка Сцяпан Дзмітрыевіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 4 г. Магілёва” ***Беларусь***………........................................................65
7. Вараб’ёва Варвара Раманаўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 4 г. Магілёва” ***Мой тата***…………………………………………….66
8. Бацяшына Ева Дзмітрыеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва” ***Родны край***……………………………………68
9. Баліна Таісія Анатольеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа №13 г. Магілёва” ***Я жыву ў Беларусі***………………………………69
10. Кайданаў Мікіта Аляксеевіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Зіма***……………………………………………70
11. Кузняцоў Міхаіл Сяргеевіч, вучань IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Акрабатыка***………………………..................71
12. Кусянкоў Аляксей Яўгеньевіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Зімовыя святы***…………………......................72
13. Сіткевіч Паліна Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Зарапад***……………………………………...73
14. Канстанціновіч Аляксандра Андрэеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Беларусачка***…………………………..75
15. Вяруціна Ульяна Мікалаеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 5 г. Магілёва” ***Абяцанне***…………….....................................76
16. Палазкова Лізавета Мікалаеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***Зімовыя забавы***……………………...78
17. Дзегцяроў Станіслаў Ігаравіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Мая Радзіма***…………..................................79
18. Шэйман Ксенія Дзянісаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Мая Беларусь***……………………………………80
19. Зяткіна Ксенія Віктараўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва” ***Карагод***………………….................................81
20. Новікава Улада Дзмітрыеўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Беларусь – мая Радзіма***………………………..82
21. Манкевіч Кіра Дзмітрыеўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Мая зямля***.....................................................83
22. Печурычка Марыя Максімаўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Першы снег***…………………………...84
23. Сацура Глеб Русланавіч, вучань III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Што раблю ў школе я?***…………….............85
24. Якавіцкая Паліна Томасаўна, вучаніца IV класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва” ***Зіма ў вёсцы***………………………………..86
25. Якімовіч Лізавета Філіпаўна, вучаніца III класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва” ***Школа***……………………………………….87

26. Далімаева Таццяна Андрэеўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва” ***Родная краіна***……………………………...89
27. Маёрава Мілана Аляксееўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа № 42 г. Магілёва” ***Зімовыя канікулы***……………90
28. Грыгор’ева Анастасія Уладзіміраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва” ***А ў нас на Каляды***…………………….91
29. Дорахава Сафія Аляксандраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва” ***Пра шчасце***........................................92
30. Грышкіна Таісія Аляксандраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Цудоўная пара***……………………………………93
31. Васілеўская Аляксандра Яўгеньеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Зімка-чараўніца***............................94
32. Ягоршын Іван Юр’евіч, вучань V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская гарадская гімназія № 1” ***Мая Радзіма***……………………………………95
33. Ульянава Анастасія Аляксееўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Да мілай маці прытулюся***.............96
34. Чахоўская Лізавета Андрэеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва” ***Зімовае***………………………………..97
35. Кавалеўская Дзіяна Дзмітрыеўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Цішыня***..........................................98
36. Ганц Ягор Уладзіміравіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва” ***Калыханка***………………………………………99
37. Малыгіна Дзіяна Дзмітрыеўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 3 г. Магілёва” ***Мой родны край***……………...................................100
38. Быстрова Ілона Аляксееўна, вучаніца VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва” ***Мая Беларусь***………………………………..102
39. Красуцкая Ксенія Паўлаўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва” ***Маме***…….................................................103
40. Лісіцын Мікіта Аляксандравіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Любай маме***……………………………………104
41. Касцючык Ксенія Уладзіміраўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 23 г. Магілёва” ***Сэрцу любы край***…………………….105
42. Шамесава Карнелія Яўгеньеўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва” ***Ціхая песня вясны***……………………106
43. Ракіцкі Міхаіл Паўлавіч, вучань VI класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва” ***Радзіма***……………….....................................107
44. Цімашкова Тамара Ігараўна, вучаніца V класа дзяржаўнай установы адукацыі “Гімназія № 4 г. Магілёва” ***Небяспечная хвароба***……………………………………108
45. Зайцава Вольга Дзмітрыеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 7 г. Магілёва” ***Зіма***……………….......................................109
46. Долбун Арцём Паўлавіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва” ***Радзіме***……………………………………...110
47. Троцкая Дар’я Русланаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва” ***Зіма прыйшла!***..............................................111
48. Варапаева Ефрасіння Мікалаеўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва” ***Маім настаўнікам***………………….112
49. Красоўская Паліна Арцёмаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва” ***Зямля Беларусі***................................113
50. Станкевіч Яніна Паўлаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва” ***Белы снег чысцюткі***…………………………114
51. Фурсава Марыя Вячаславаўна, вучаніца VIII класа дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва” ***Пачуйце мяне, сябры!***...................115

52. Яновіч Таісія Валер'еўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 23 г. Магілёва" ***Зорка жыцця***……………………………...117
53. Машчынская Анастасія Аляксандраўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва" ***Зямля святая***..................................118
54. Мартынава Марыя Дзмітрыеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва" ***У дзень Перамогі***……………………120
55. Шацкая Караліна Дзянісаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва" ***Малюнкі позняй восені***.................................121
56. Хадунько Вікторыя Дзмітрыеўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі "ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа № 42 г. Магілёва" ***Чараўніца зіма***…122
57. Маменчыкаў Дзяніс Міхайлавіч, вучань VII класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 8 г. Магілёва" ***Калі б не мы…***……………………........123
58. Качанава Ніколь Міхайлаўна, вучаніца VII класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва" ***Зварот да ветэранаў***…………………………125
59. Навічонак Мілена Уладзіміраўна, вучаніца XI класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 1 г. Магілёва" ***Роздум***………....................................126
60. Нікіценка Ксенія Дзянісаўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія № 3 г. Магілёва" ***Простае падарожжа***…………………………………..127
61. Волкава Ганна Юр'еўна, вучаніца XI класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва" ***Восеньскі цуд***................................................128
62. Юрчанка Валерыя Сяргееўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва" ***Мая Радзіма***……………………………………129
63. Сяргутка Уладзіслаў Сяргеевіч, вучань X класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва" ***Якое шчасце – проста жыць…***....................130
64. Зарэмская Аляксандра Уладзіміраўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва" ***Адчуванне шчасця***………………….131
65. Мухіна Анастасія Сяргееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 9 г. Магілёва" ***Вярнуся на Радзіму я***.....................................132
66. Лабанава Ганна Уладзіміраўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва" ***Праведайце маці***………………………………133
67. Гур'янава Віта Валянцінаўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва" ***Ночка Купальская***.......................................134
68. Казакова Ангеліна Дзмітрыеўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва" ***Усмешка***……………………………135
69. Галыга Валерыя Сяргееўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва" ***Жыццё – гульня, цікавая вандроўка***............136
70. Казлова Паліна Аляксандраўна, вучаніца XI класа дзяржаўнай установы адукацыі "Магілёўская гарадская гімназія № 1" ***Успамін пра першае каханне***…..137
71. Ластаўкін Дзяніс Уладзіміравіч, вучань XI класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 8 г. Магілёва" ***Галоўны скарб жыцця***.................................138
72. Маісеева Аліна Леанідаўна, вучаніца XI класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва" ***Дзівосны шлях***.............................................139
73. Несцяровіч Дар'я Аляксандраўна, вучаніца IX класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва" ***Выходжу на вуліцу***………………..141
74. Клімава Валерыя Вітальеўна, вучаніца X класа дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва" ***Матулечцы роднай***......................................142

## *Я люблю Караткевіча творы*

*Я люблю Караткевіча творы:*
*Адкрывае для нас ён прасторы*
*Дабрыні, цеплыні, хвалявання,*
*Спачування, надзеі, кахання.*

*Яго творы – апавяданні і казкі –*
*Для нас яны быццам падказкі:*
*Навучаюць людзей жыць праўдзіва,*
*Не зайздросціць, рабіць справядліва.*

*Аб прыродзе ён піша з душою.*
*Проста цуд! Захапляйся красою!*
*Убачыш лес, азёры і рэкі*
*І палюбіш усё гэта навекі!*

*Калі ж у творы ўзнікае каханне,*
*Там прыгоды, начныя спатканні,*
*Там усмешкі, там слёзы на тварах.*
*І надзеі на лепшае ў марах!*

*Я люблю Караткевіча творы:*
*У іх краіны радзімай узоры.*
*Іх чытаю заўсёды з ахвотай,*
*Бо напоўнены мілай пяшчотай.*

*Башарымава Маргарыта Аляксееўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская*
*гарадская гімназія № 1”*

## *Акраверш "У нашага народа ёсць паэт…"*

*У нашага народа ёсць Паэт,*
*Лагодны, мудры, геніяльны творца!*
*Адкрыты, шчыры, як бязмежны свет,*
*Дзівосны талент зіхаціць, як сонца!*
*Знайдзі радкі і прачытай душой –*
*І зразумееш сэрцам таямніцы*
*Магутнай Бацькаўшчыны, мілай, дарагой,*
*І заструменяць чыстыя крыніцы!*
*Радзіма дыхае ў творах і жыве,*
*Кранае мужнасцю, адвагай і любоўю.*
*А крылы белыя ў празрыстай сіняве*
*Ратуюць, ахінаюць дабрынёю!*
*Айчына… Продкі… Наш нязводны род…*
*Такое непахіснае змаганне!*
*Карэннем моцным звязаны народ,*
*Ен будзе вечна сустракаць світанне!*
*Вясёлкай думкі водзяць карагод…*
*І радасцю, задавальненнем гэтым*
*Чытач падзякуе любімаму Паэту!*

*Сафонава Сняжана Сяргееўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва"*

## *Ганаруся…*

*Наша родная зямля*
*Славіцца людзьмі здаўна…*
*Ёсць пісьменнікі, паэты.*
*Касманаўты і атлеты.*

*Тут першадрукар Скарына,*
*Манахіня Ефрасіння*
*Імкнуліся сваім пяром*
*Унесці кнігу ў кожны дом.*

*Творы Коласа, Купалы*
*Ва ўсім свеце прагучалі.*
*«Песнярамі» іх завуць –*
*Мову родную нясуць.*

*Касманаўт Алег Навіцкі,*
*Домрачава – біятланістка!*
*І наш «Бацька» - прэзідэнт*
*Знакаміты на ўвесь свет…*
*Праслаўляюць Беларусь!*
*- Га-на-ру-ся! Ганарусь!*

*Стальмашок Юлія Алегаўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

## *У Ляўках*

*Шум лесу асенняга, палёт павуцінкі,*
*Плынь ціхай ракі і тонкай ільдзінкі –*
*Я ўсё гэта бачыла, усё адчувала:*
*Віцебск.*
*Орша.*
*Ляўкі і…*
*Купала…*

*Тут ён працаваў, тут пісаў свае творы.*
*Драўляная хата, лес у яркім уборы,*
*І рэчка, і сцежка – усё помніць пра гэта,*
*Пра творчыя пошукі, мары паэта.*

*Размовы ў сям'і і сустрэчы з сябрамі,*
*Прагулкі лясамі, лугамі, палямі,*
*Салодкае лета, квітнеючы лён…*
*Каб гэтым праніклiся мы, хацеў ён.*

*Мы бачым, мы чуем, мы ўсё разумеем:*
*Ляцім разам з лётчыкам паветраным змеем,*
*Бяжым басанож за вясёлай Алесяй*
*І папараць-кветку шукаем у лесе.*

*А вершы яго назаўжды будуць з намі,*
*Мы будзем чытаць іх Купалы вачамі.*

*Аношка Ксенія Юр'еўна,*
*вучаніца ІХ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 2 г. Магілёва"*

## *Чытаючы Уладзіміра Караткевіча*

*Той, хто шануе краіну,*
*Любіць чытаць яго творы.*
*Ён з Беларуссю адзіны –*
*Кожны радок так гаворыць.*

*Там ажываюць паданні,*
*Сцежка ў мінулае ўецца.*
*Мова яго – мілаванне,*
*Верш пасяляецца ў сэрцы.*

*Старая казка ізноўку*
*Нас дабрынёй напаўняе.*
*Мудрасцю сына й вяскоўцаў*
*Бацька нямоглы хавае.*

*Вось з лебядзінага скіту*
*Птушкі ўздымаюцца ў неба.*
*Золата – побач з блакітам.*
*Восенню ціха на глебу*
*Падае зноў – і знікае*
*Лісце каштанаў і клёнаў…*

*Хто тыя творы чытае –*
*У Беларусь улюблёны!*

*Маркава Ганна Уладзіміраўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва"*

### *Рыгору Барадуліну*

*Пайшоў ты "ў неба пехатою"*
*Аднойчы ў вясновы дзень –*
*І зажурыліся нябёсы,*
*На твар зямлі лёг змрочны цень.*

*Пайшоў да маці, да Куліны,*
*Любімай, роднай, дарагой,*
*Што наталіла прагай жыцця,*
*Павагай да зямлі сівой.*

*Што словам продкаў навучыла,*
*Яскравым, сціплым, гаваркім,*
*Смяшынкамі душу спавіла,*
*Каб свет здаваўся неблагім.*

*І слова матчына заззяла,*
*У душы глыбока прарасло,*
*Каб на шляху зямным у неба*
*Багата парасткаў узышло.*

*Ты падарыў нам сваё неба,*
*Бясконцае ў натхненні дзён.*
*Ты абудзіў любоў да мовы,*
*Каб мы пілі яе нагбом.*

*Ты азарыў каханнем зорку,*
*Што йшла па росах нацянькі.*
*Ты любоўю сагрэў зямельку –*
*Арыстакратку жывой даўніны.*

*Ты акрыліў душу спагадай,*
*Каб чалавечнасць прарасла,*
*Ты атуліў нас верай у Бога,*
*У свянцоны прасцяг дабра…*

*Пайшоў ты “ў неба пехатою”*
*Аднойчы ў вясновы дзень,*
*Каб усміхаліся нябёсы,*
*Каб на зямлі жыў светлы цень…*

*Сушко Вольга Аляксееўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва”*

# *Караткевічу*

*З далёкіх нам ужо гадоў*
*Плыве ладдзя дняпроўскай хваляй.*
*А ў ёй – гісторыя вякоў,*
*Імкненне продкаў к лепшай долі.*

*Плыве ладдзя аж з небыцця,*
*Нашчадкам гонар абуджае.*
*І з кожным крокам адкрыцця*
*Паэта слова акрыляе.*

*Паэт, празаік, драматург*
*Краіне роднай быў адданы.*
*Пакінуў рана ён сяброўскі круг,*
*"Зямлю пад белымі крыламі".*

*Ягоны ціхі запавет святы*
*Краіны моладзь не забудзе:*
*Любіць Радзіму назаўжды!*
*Бо Караткевіч – Быў! Ёсць! Будзе!*

*Крылова Марыя Дзмітрыеўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 28 г. Магілёва"*

## *Уладзіміру Караткевічу*

*Дзе твой край? Там, дзе*
*Колас з валошкай у полі жытнёвым сябруе*
*І ручай веснавы сваю ціхую песню пяе.*
*Дзе над хатай гняздо белы бусел майструе*
*І дзе лес старажытны размовы-бяседы вядзе.*

*Дзе твой край? Там, дзе*
*Людзі ў шчасці жывуць і не ведаюць гора,*
*Дзе ў кожнага свой асаблівы жыццёвы маяк.*
*Дзе каханне і радасць – бязмежнае цёплае мора,*
*І ў краіне ты кожнаму і сябар, і брат , і зямляк.*

*Дзе твой край? Там, дзе*
*“Песні” твае, нібы зоркі яскравыя ў сэрцы,*
*Вечна жыць будуць у памяці і думках людзей.*
*Дзе ў дарозе нялёгкай ёсць родныя, любыя месцы,*
*Дзе гарыць незгасальнае полымя веры, кахання, надзей!*

*Кубракова Віялета Сяргееўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская*
*гарадская гімназія № 1”*

## *Пад зоркай Караткевіча*

*Беларускі народ… Смелы, мужны, рашучы, адважны,*
*Разам з тым памяркоўны і сціплы, гасцінны і мілы.*
*Колькі ты ўзрасціў тых сыноў, што ў сэрцы бясстрашна*
*Неслі гонар за край свой бацькоўскі, любоў да Радзімы?!*

*Іх імёны складаюць гісторыю нашай краіны.*
*На яе небасхіле чароўнымі зоркамі ззяюць*
*Багдановіч і Колас, Купала, Бядуля, Лучына,*
*Шмат і іншых, пісьменніцкі талент каторыя маюць.*

*А ярчэй Караткевіча зорка ў бездані свеціць,*
*Рассякае гісторыі цемру, вядзе да збавення.*
*Гэты промень святла ў душу і ў сэрца нам меціць,*
*Быццам хоча раскрыць яго творчасць для ўсіх пакаленняў.*

*Вось лунаюць буслы над прасторамі нашай краіны,*
*Пад іх белымі крыламі хмура стаіць чорны замак,*
*І нямоглыя бацькі імкнуцца ў скіт лебядзіны,*
*І ўспамінамі кружыцца рудае лісце каштанаў.*

*Па дрыгве, па імшарах вядомым яму толькі шляхам*
*Безупынна імчыць і імчыць дзікае паляванне,*
*Каласы пад сярпом нахіляюцца самі ад страху,*
*Ну а госць, як вядома, прыходзіць на золкім світанні.*

*І нам нельга забыць, што Хрыстос прызямліўся ў Гародні,*
*Што цыганскі кароль і Кастусь нам паказаны дбайна.*
*Млын на Сініх Вірах назаўсёды ў гісторыю ўвойдзе,*
*І сівая легенда пакажа пісьменніка тайны.*

*Караткевіч раскрыў нам народнай гісторыі лёсы,*
*І шануюць і любяць за гэта пісьменніка людзі.*
*І пакуль яго зорка святлом рассякае нябёсы,*
*Я адзначу, што ён з намі Быў, з намі Ёсць, з намі Будзе!*

*Ларчанка Паліна Сяргееўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва"*

# Паэту

Душой любіць сваю Радзіму,
Прастор палёў і рэчак гул
Было дано яму ад Бога,
Ён боль народны сэрцам чуў!

Узышла яго Венера-зорка
І ззяе шмат ужо гадоў.
І зернем кінутае слова
Прабілася сярод снягоў.

Яму ўдзячны пакаленні
За вершы, што ад сэрца ішлі,
Што на чужбіне не адрокся
Ад мовы нашай і зямлі!

За веру, што народ прачнецца,
Настане светлая пара
І сімвалам краіны стане
Цвяток радзімы васілька.

*Зямлінская Паліна Дзянісаўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва”*

## *Мой Уладзімір Караткевіч*

*Я бяру ў рукі простую кнігу.*
*Не надта прыгожая вокладка.*
*Не яркая, але своеасаблівая.*
*Чамусьці, як гавораць, "чапляе вока".*
*Я адкрываю. На першай старонцы –*
*Партрэт. Вельмі добрыя вочы.*
*Усмешка – маленькі кавалачак сонца…*
*І зноўку – ласкавыя, мірныя, родныя вочы!*
*Ён – Караткевіч. Паэт і пісьменнік.*
*Зямляк мой, сусед… Орша, Гомель, Мсціслаў.*
*Побач ён жыў, а я і не верыў,*
*Што так вось здараецца. І вось я сам*
*Хутка чытаю пра яго шлях жыццёвы.*
*Даведаўся, маці вучылася тут,*
*У Магілёве. А там, дзе Першая школа*
*Не раз праходзіў мой міма маршрут.*
*Размову з бацькамі пачаў за вячэрай:*
*Што ім вядома пра яго творчы шлях?*
*Здзівіўся.Як шмат я не ведаў.*
*Са зборнікам вершаў з'явіўся ў дзвярах*
*Мой тата. "Быў. Ёсць. Буду".*
*Чыталі ўвесь вечар.Я слухаў, уздыхаў…*
*І думаю, што не забуду,*
*Як добра паэт пра Радзіму сказаў.*
*Так проста, так шчыра пра любыя месцы,*
*Пра "пушчы, як храмы", пра "памяць званоў"…*
*І пра людзей, пра іх душы і сэрцы,*
*Пра працу, пра памяць і пра любоў!*
*Кім стану ў сталасці?*
*На гэта пытанне сёння яшчэ не знойдзен адказ.*

*Мой Караткевіч вучыць адказнасці,*
*Цаніць "Зямлю пад белымі крыламі" ён вучыць нас!*
*Я – грамадзянін. Я – сын Беларусі!*
*Да ёй, як і паэт, адчуваю любоў,*
*Радасць , павагу! Людзьмі – ганаруся,*
*Мінулым – цікаўлюся, у будучыню крочу ў акружэнні сяброў!*

*Івуцін Іван Яўгенавіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва"*

## *Асалода для вачэй*

*Уяві, што было б тады,*
*калі б у свеце не цвілі сады,*
*кветак не было бы  колькі год.*
*Бясколерным быў бы асярод!*
*Цяпер у акенца паглядзі хутчэй:*
*якая асалода для вачэй!*
*Прыгожыя дрэвы і хмызнякі,*
*бераг зялёны каля ракі.*
*Хочаш ты, каб прырода жыла*
*і сябрам тваім заўсёды была?*
*Кожны павінен аб ёй клапаціцца!*
*І прырода ізноў адрадзіцца!*

*Клачкова Маргарыта Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Магілёўская*
*гарадская гімназія № 1”*

## *Пабывайце летам у лесе!*

*Пабывайце летам у лесе!*
*Як цудоўна ўсё вакол!*
*Праз галінкі сонца свеціць,*
*Робіць казачным  увесь бор!*

*Мяккім дыванам зялёным*
*Засцілае мох зямлю,*
*Там сасна спявае  клёну*
*Песню, што я так люблю.*

*Дзесьці дзятла стук я чую…*
*Прыглядзелася – вунь ён!*
*На макушку сеў такую,*
*Што ледзь знойдзеш, вось шпіён!*

*А пад ногі паглядзіце!*
*Асцярожна, не хадзіце!*
*Тут і ягады чарніцы,*
*Тут сініцы-чараўніцы.*

*Сэрцу майму так міла,*
*Так прыемна, цёпла так,*
*Быццам гэтую карціну*
*Дзіўны маляваў мастак.*

*Сенакосава Вера Аляксандраўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва”*

## *Няхай планета будзе свабодна!*

*Пластык, папера і шкло,*
*Калі аб'яднаны ў адно,*
*З'яўляюцца брудам і смеццем,*
*Што па зямлі нясе вецер.*

*Пакутуе маці-Зямля.*
*Няма ёй святога жыцця.*
*Не ўзросціць яна і травінкі.*
*А з пластыка – толькі бутылкі.*

*Чакае яна дапамогі,*
*Збаўлення ад смецця, аблогі.*
*Каб дыхаць ёй чыста, прывольна,*
*Квітнець, зелянець ёй раздольна!*

*Павінны мы ведаць і знаць,*
*Як правільна смецце збіраць.*
*Хай пластык, папера і шкло*
*Ніколі не будуць у адно!*

*Збіраем іх толькі асобна!*
*Планета хай будзе СВАБОДНА!*

*Сомава Ганна Сяргееўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Гімназія № 3 г. Магілёва"*

## *Успамін*

*Была вясна. Спявалі птушкі,*
*І гукі несліся ўгару.*
*Зямлю ўзараць, засеяць соткі*
*Было патрэбна спадару.*
*Ды раптам неба пацямнела,*
*Сабрала хмары ў карагод,*
*Плутоній з цэзіем змяшала,*
*Забрудзіла зямлю на сотні год.*
*АЭС, Чарнобыль і рэактар*
*( Усе дачуліся тады)*
*Нясуць няшчасці, боль, атруту*
*У нашы сёлы, гарады.*
*Не ведаў дзед, не думаў тата,*
*Што трэба вёску пакідаць*
*І дом, і склеп, і нават хату*
*З падмурка зноў пабудаваць.*
*Прайшлі гады…На новым месцы*
*Усё, здаецца, нажылі.*
*Аднак жыве дасюль у сэрцы*
*Смак той крынічнае вады,*
*Што працякала побач з вёскай,*
*Дзе нарадзілася сям'я.*
*А зараз толькі слязой горкай*
*Нясе ўспамін пра дом штодня.*

*Галайда Аляксандра Алегаўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва"*

## *Радзіма пачынаецца*

*Радзіма пачынаецца са сцежкі,*
*Якую ў дзяцінстве пракладаў,*
*І бацькавай, і матчынай усмешкі,*
*Іх рук, што ў сваіх руках трымаў.*

*Радзіма пачынаецца з лясочка,*
*Што зелянее кожную вясну,*
*Ён лічыць і цябе сваім сыночкам,*
*Бо сок бяроз нагадвае слязу.*

*Радзіма пачынаецца з крынічкі,*
*Што стане з часам буйнаю ракой,*
*З чырвоных журавін, дурніц, сунічак,*
*Што поўняць водарам світанак кожны твой.*

*Радзіма пачынаецца з любові*
*Да той зямлі, дзе нарадзіўся і жывеш,*
*Да сцежкі той ад роднага парога,*
*Якую басанож вясною пракладзеш.*

*Ці пойдзе сцежка ў ягады лясныя,*
*Ці да ракі, ці згубіцца ў траве?*
*З дзяцінства патрапляе яна ў мроі,*
*Прыходзіць і на яве, і ў сне.*

*Другакоў Яраслаў Аляксандравіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 35 г. Магілёва"*

## *Беражы прыроду*

*Каб зберагчы прыроду ў свеце*
*Нашчадкам нашым назаўжды,*
*Павінны ведаць усе дзеці*
*І ў гэты час, і праз гады,*

*Што смецце трэба сартаваць:*
*Асобна пластык і паперу.*
*Пра шкло, метал не забываць.*
*У спажыванні ведаць меру.*

*У спякотны дзень і ў залеву*
*Хай свежы ветрык дзьме ў твар.*
*Няхай растуць усюды дрэвы,*
*Паветра будзе, бы нектар!*

*Мы берагчы ваду павінны –*
*Наш найкаштоўнейшы рэсурс.*
*Захоўваць родную прыроду*
*Павінен кожны беларус!*

*Жуйкова Соф'я Паўлаўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва"*

## *Лясы Беларусі*

*Цудоўныя, прыгожыя лясы Беларусі,*
*Няма больш на свеце такіх:*
*Растуць журавіны, суніцы ў акрузе,*
*Не трэба нам, мусіць, другіх.*
*Радуюць вока дубы ўдалыя*
*І елкі, што гнуцца адна да адной,*
*Бярозы, як сёстры, стаяць маладыя,*
*Ды шэпчуцца івы над ціхай ракой.*
*Прайсціся па лесе – адна асалода.*
*Такога не знойдзеш нідзе:*
*Паветра напоўнена водарам мёду,*
*І сонца  бліскучы адбітак у вадзе.*
*А сосны вясною ў момант квіцення*
*Так пахнуць смалою - прыемнасць адна.*
*Цалебны тут водар, гасцям на здзіўленне,*
*І хочацца крыкнуць: "Беларусь - ты мая!"*
*Беражыце, што маеце, вы – беларусы,*
*Такіх скарбаў не знойдзеце больш на зямлі!*
*Беражыце рэкі, зямлю і нябёсы,*
*Каб нашчадкі таксама ў прыгажосці жылі!*

*Біндасава Марыя Андрэеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 34 г. Магілёва"*

## *Беларускі лес*

*Беларускі наш лес,*
*поўны розных цудаў.*
*На сасну мядзведзь узлез.*
*Мабыць, мёд унюхаў.*

*У дупле сядзіць вавёрка,*
*шышкі разбірае.*
*Дзяцел – доктар наш лясны*
*па ствале дзяўбае.*

*Беражыце ўсё жывое,*
*людзі, на планеце!*
*Каб убачыць прыгажосць*
*маглі нашы дзеці!*

*Аўдашкін Глеб Паўлавіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва"*

## *Стамілася надвор'е*

*Мы чакалі ўсе ў снежні,*
*Што ўбачым снег нарэшце.*
*Але снежань падмануў:*
*Дождж імжыў і вецер дзьмуў!*

*Мабыць, месяц снежань хворы?*
*Не! Стамілася надвор'е*
*І падкінула сюрпрыз –*
*Кліматычны катаклізм.*

*Дыхалася каб планеце,*
*Сартыруйце, дзеці, смецце!*
*Калі рэшткі раздзяляеш,*
*Ты прыроду паважаеш!*

*Калі гэта зробім мы –*
*Вернем клімат на Зямлі,*
*Прыйдзе зноў у гарады*
*Снег ў снежні, як заўжды!*

*Бурчанка Яраслаў Дзмітрыевіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Гімназія № 3 г. Магілёва"*

## *Калісьці чуў я на сяле…*

*Калісьці чуў я на сяле*
*гісторыю адну*
*Пра двух сябровак  верных –*
*бярозу і сасну.*

*Два семені раслі ў зямлі-*
*бярозы і сасны.*
*А выраслі вялікімі*
*і сталі дзве сястры.*

*Вось неяк побач майстар ішоў:*
*“Бярозу я люблю!*
*Бярозавыя вырабы*
*я для сябе зраблю!”*

*Але абдымкам моцным*
*бярозу абхапіла*
*сасна – сяброўка верная –*
*са ўсёй жыццёвай сілай!*

*І ад здзіўлення*
*майстар тут рукі апусціў,*
*сяброўства  рушыць вернае*
*не меў ніякіх сіл!*

*Розанцава Соф’я Антонаўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Магілёўская гарадская гімназія № 1”*

## *Любы мой горад*

*Узняўся над Дняпром, нібыта волат,*
*Увекавечан славаю вякоў,*
*Магутны і прыгожы, мілы горад,*
*Наш гераічны горад  Магілёў.*

*Тут ёсць алея Славы для герояў,*
*За мір  змагаліся яны,*
*Каб не было фашызму больш ніколі*
*І каб ніколі не было вайны.*

*Сваіх герояў горад не забудзе.*
*І дзень, і ноч гарыць жа ж там агонь.*
*Іх подзвіг будуць вечна помніць людзі.*
*Героям –  Слава! Нізкі ім паклон.*

*Спіць Магілёў над ціхаю ракою,*
*Мільгаюць рознакаляровыя агні.*
*Хай сцерагуць пакой твой, мірны горад,*
*Заўжды чатыры бронзавыя львы!*

*Сілкоў Рустам Віктаравіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Горад сэрца майго*

*Горад велічнай славы! Стаіш і глядзіш у нябёсы.*
*Прыклад мужнасці, вечны ўспамін для нашчадкаў тваіх.*
*Каля кожнага помніка шчырыя горкія слёзы*
*Самі коцяцца, нават не думаю стрымліваць іх.*
*Горад продкаў, якія з вайны не змаглі ўсе вярнуцца,*
*Шмат аддадзена жыццяў, збярог каб свабоду сваю.*
*Назаўжды тых імёны ў памяці ў нас застануцца,*
*Шанаваць будзем іх, берагчы, як часцінку тваю.*
*Край дзяцінства майго! Тут зрабіла я першыя крокі,*
*Тут жылі мае продкі і зараз мая тут сям'я.*
*Кожны дзень справы дома, сустрэчы з сябрамі, урокі –*
*Усё пакуль што з табою, ад цябе неадрыўная я.*
*Горад сэрца майго! Гэта плошчы, праспекты, бульвары,*
*Гэта хлопца Машэкі твая валатоўка-гара.*
*Ты  вітаеш усіх сваёй шчырай усмешкай на твары,*
*Зелянінай у парках і сіняй істужкай Дняпра.*
*Ты заўсёды прывабны, кране цябе радасць ці скруха,*
*У час, калі абуджаешся зранку, і ў час, калі спіш.*
*Восень лісцем цябе замятае, ці дзьме завіруха –*
*Для мяне ўсё адно: у маім сэрцы ты зоркай гарыш.*
*Магілёў! Ты жыві і квітней! Будзь заўсёды ты лепшым!*
*Горад шчасця майго! Прыгажэй і паказвай сябе!*
*Для тваіх жыхароў ты заўсёды пад нумарам першым.*
*Шчырым сэрцам, адданай душою мы любім цябе!*

*Масейкіна Анастасія Русланаўна,*
*вучаніца Х класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 40 г. Магілёва"*

## *Буйніцкае поле*

*Буйніцкае поле. Вялікае поле.*
*Там дзеці гуляюць па вузенькіх сцежках.*
*На ім так спакойна… На ім так прывольна!*
*На тварах людзей дабрыня і ўсмешкі.*

*Ніхто з іх не бачыў той страшнай гадзіны,*
*Калі яно ўсё ў крыві ўтапала!*
*Як боты варожыя смела хадзілі!*
*Мінула ўсё… Поле звычайнае стала.*

*Не бачыў ніхто. А можа забыць?*
*Навошта ўсе жахі ў сэрцы трымаць?*
*Можа поле засеяць і жыта расціць?*
*Можа проста на полі дамы будаваць?*

*Але шэпча зямля: "Я бачыла.*
*Кожны крок, кожны рух запомніла.*
*І траву, ад крыві гарачую,*
*У глыбінях сваіх я захоўваю".*

*І сказала неба: "Я бачыла,*
*Як гарэла ўсё навакolле…"*
*Не забудзем. Не будзе страчана*
*Памяць пра Буйніцкае поле.*

*Караткевіч Цімафей Антонавіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва"*

## *Горад мой*

*Я жыву з дзяцінства Магілёве,*
*У горадзе з легендаю прыгожай,*
*Што разнеслася з вадой Дняпровай*
*І прыцягвае нас гукам кожным.*

*Нават сам Купала захапіўся*
*Словам, што лілося ў век ад веку.*
*Талентам народным ён натхніўся*
*І стварыў легенду пра Машэку.*

*Горад мой! Пазнаў ты шмат пакутаў,*
*Гнуўся над сахой і тапаром,*
*Быў не раз ты ў кайданы закуты,*
*Ды не быў ніколі ты рабом!*

*Сустракаў сяброў ты з хлебам-соллю,*
*Ворагаў жа прэч са стрэльбай гнаў.*
*Змучаны ад цяжкіх ран, ад болю,*
*У сорак першым мужна бой прымаў.*

*Зараз ты мацнееш, расцвітаеш,*
*Зіхаціш пад промнямі агнёў,*
*Прыгажосцю вока захапляеш*
*І гасцей вітаеш кожным днём.*

*Жыхары тут веру адрадзілі –*
*Цешыць сэрца калакольны звон.*
*Дрэвамі пустэчу засадзілі –*
*Заспявалі птушкі ва ўнісон.*

*Вабіць новы парк у Падніколлі:*
*Турнікі, арэлі, трэнажоры…*
*Сумна не бывае там ніколі,*
*Для забаў – вялікая прастора.*

*Рада, што жыву я ў Магілёве,*
*Я люблю свой слаўны родны кут.*
*Хай жа ён жыве у шчасці-долі!*
*Хай жа вечна сонца ззяе тут!*

*Халаімава Дзіяна Уладзіміраўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 13 г. Магілёва”*

## *У чэрвені 44-га…*

*Уздоўж Дняпра яны йшлі, адважныя,*
*Беларускай зямлі сыны.*
*Магілёўшчыне, краю роднаму,*
*Неслі мір і спакой яны.*
*Кожны хлопец з салдацкаю каскаю,*
*Твары копаццю parаслі.*
*За плячыма іх зброя ляскала,*
*Пад падэшвамі – мазалі.*
*Гімнасцёркі на спінах выцвелі*
*За апошні ў жыцці паход.*
*І на целе салдацкім рытвіны*
*Праараў, быццам плугам, пот.*
*Не звярталі ўвагі, смелыя,*
*На крывавыя мазалі,*
*І на раны свае счарнелыя,*
*Пацямнелыя медалі.*
*Толькі сцярпець бы, толькі б выстаяць,*
*Думкі цяжкія адагнаць…*
*Пад шалёным напорам ворага*
*Зямлю родную адстаяць.*
*Каб народ магілёўскі ў час начны*
*Толькі мірныя бачыў сны.*
*Уздоўж Дняпра яны йшлі, адважныя,*
*Беларускай зямлі сыны…*

*Касілава Аляксандра Валер'еўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва"*

## *Родны горад*

*Магілёў. Горад мой Магілёў.*
*Горад пушчаў, сівых курганоў,*
*Горад вольных рыбацкіх асноў,*
*Горад слаўных сыноў-ваяроў.*

*Горад-волат і горад-змагар,*
*За цябе сваё сэрца аддам.*
*Хай мінае час, льецца ракой,*
*А цябе ахінае спакой.*

*Хай квітнее мой горад у вяках,*
*Гмахаў новых сталее размах.*
*І няхай на узбярэжжы Дняпра*
*Хваляй коціцца жыцця рака.*

*Нарадзіўся і вырас я тут,*
*Гэта мой мілы дом, родны кут.*
*Ён ад прадзедаў дадзены мне.*
*Хай жа слава яго не міне.*

*Хай гучыць на скрыжалях вякоў:*
*«Мой народ! Беларусь! Магілёў!»*

*Музычэнка Марат Генадзьевіч,*
*вучань IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 39 г. Магілёва”*

## *Мая малая радзіма*

*Мая малая радзіма –*
*Гэта горад Магілёў,*
*Дзе спрадвеку Дняпро льецца*
*Між узгоркаў і кустоў.*
*Ад Машэкі і да «сёння»*
*Мае больш за сем вякоў,*
*І гісторыя ў стагоддзях*
*Славіць родны Магілёў.*
*Шмат было выпрабаванняў:*
*І пажарам, і вайной,*
*Але ж з попелу ўстаў ён,*
*Горад славы баявой.*
*Ну, а сёння ён красуе*
*Над прасторамі ракі,*
*І ўздымаюцца будынкі,*
*Як пасля дажджу грыбы.*
*Растуць новыя раёны,*
*Вабяць нашых жыхароў.*
*Толькі ў сэрцы Магілёва –*
*Веліч даўніх забудоў.*
*І калі гляджу навокал,*
*Ганаруся ўсёй душой,*
*Што Радзімаю завецца*
*Горад родны над ракой.*

*Стралкоўская Дар'я Антонаўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 41 г. Магілёва"*

## *Мой горад*

*Люблю цябе моцна, мой горад,*
*Праспекты твае і масты.*
*Стаіш ты магутны, як волат*
*Ля хваляў дняпроўскай вады.*

*Ты велічны быў у часы ўсе:*
*У гадзіны ўзлётаў, бяды*
*І меў Магдэрургскае права*
*У бог-весць якія гады.*

*Вунь там, дзе ў лазоўі прасека*
*І бераг палогі, пусты,*
*Мне мроіцца, быццам Машэка*
*З сябрамі рыхтуе плыты,*

*Каб ноччу на тым узбярэжжы*
*У змрочнай, начной цішыні*
*Успыхнулі стужкай мяцежнай*
*Над панскім маёнткам агні…*

*Ты біўся з фашысцкаю зграяй,*
*Абаронцы твае ў барацьбе*
*Целам сваім закрывалі*
*Любы падыход да цябе.*

*А ноччу, як цемра загляне,*
*Над звонніцай зорка вісіць.*
*То, можа, Карпінскае Тані*
*Вялікае сэрца гарыць.*

*Памяць аб іх неўміручая.*
*А помнікам будзе для іх*
*Твая прыгажосць і магутнасць*
*І ордэн на сцягах тваіх.*

*Стагначоў Багдан Мікалаевіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 3 г. Магілёва”*

## *Абяцанне роднаму гораду*

*Гляджу я на карту сваёй Беларусі:*
*І колькі ў ёй існуе гарадоў!*
*Я кожным кутком сапраўды ганаруся,*
*Але самы лепшы з усіх – Магілёў!*
*Нам праўду раскажа старая легенда*
*Пра мужнага хлопца сарві-галава.*
*Няма для мяне даражэй кампліментa:*
*Наш горад узнік на магіле ільва.*
*Тэатры, музеі, каткі, стадыёны,*
*І дзесьці ля рэчкі – стары манастыр.*
*А гук яго звона, працяжны, натхнёны,*
*На сцежках жыццёвых для нас павадыр.*
*Гасцей дарагіх адусюль запрашаем*
*У наш горад утульны на быстрым Дняпры!*
*Сустрэнем, сагрэем, спяем і сыграем,*
*А потым праводзім, але ж да пары!*
*Хаджу па дварах, дзе прабегла дяцінства...*
*Наперад вядзе дарагі ўспамін.*
*Я з гэтай зямлёй адчуваю адзінства*
*У час гэтых светлых і добрых гадзін!*
*І дзе б я ні быў, непазбежна вяртанне!*
*І колькі б у жыцці ні мінула гадоў,*
*Даю я сабе ў гэты час абяцанне:*
*У сэрцы маім назаўжды Магілёў!*

*Казакоў Даніл Віктаравіч,*
*вучань IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 18 г.Магілева”*

## *Наш родны горад*

*Наш родны горад, горад Магілёў,*
*Дзе на масту сустрэнем з бронзы львоў…*
*Ён гераічны, велічны, цудоўны,*
*Ён ведаў росквіт, славу, войны.*

*Сам Пушкін у горад двойчы прыязджаў,*
*Палярнік Шміт тут слаўны шлях свой пачынаў.*
*Наш горад ледзь не стаў сталіцай.*
*Так, Магілёву ёсць чым ганарыцца!*

*Калі Вялікая Айчынная вайна настала,*
*Фашысты жглі дамы ў Падніколлі,*
*На барацьбу ўсе жыхары тады паўсталі.*
*Мы помнім подзвіг Магілёўскага падполля.*

*З фашыстамі бясстрашна ваявалі*
*На берагах крутых Дняпра і Дубравенкі…*
*Мы  не забудзем, як наш горад  ратавалі*
*Куцепаў, Фацін, Грышын, Лазарэнка…*

*І як наш горад вораг знішчыць ні стараўся,*
*Ён зноў адбудаваўся, зноў расцвёў.*
*Прыгожым, непакораным застаўся*
*Наш родны, наш любімы Магілёў!*

*Пілецкі Іван Алегавіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г.Магілева”*

## *Заасад*

*На ўскрайку Магілёва*
*Размясціўся заасад.*
*Там прыгожа і ўтульна,*
*Лепей убачыш толькі ў снах.*

*Там прыгожыя жывёлы:*
*Птушкі, розныя звяры.*
*З імі хочуць стаць сябрамі*
*І маленькі, і  стары.*

*Лось магутны, зубр дужы*
*Рады бачыць нас у гасцях.*
*Ім хавацца нецікава*
*Ад людзей цяпер у лясах.*

*На ўскрайку Магілёва*
*З намі побач увесь час*
*Найдабрэйшыя жывёлы.*
*Шанаваць іх- клопат наш*

*Акуленка Ульяна Максімаўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 5 г. Магілёва”*

## *Магілёў*

*Слаўны горад такі Магілёў на Дняпры,*
*На яго паглядзець прыязджайце, сябры!*
*Прыгажосць розных помнікаў, непаўторных будынкаў*
*Любавацца прынудзіць не адну вас хвілінку,*
*Заварожаць яны дзіўнай архітэктурай,*
*І гісторыяй слаўнай, і цудоўнай культурай.*
*Сціcне, мабыць, вам сэрца ўспамінам да болю*
*Аб Айчыннай вайне тут на Буйніцкім полі.*
*І разбудзяць у вас веру, нібы ранкам зара,*
*Званы Свята-Мікольскага манастыра.*
*Парк забаў і прагулак такі ў Падніколлі,*
*Той, хто быў тут, ужо не забудзе ніколі.*
*Як славутасць мясцовая тут заасад,*
*І звяроў розных, птушак у ім вельмі шмат.*
*Побач з ім ёсць цікавы горад Майстроў,*
*Там рамеснікаў шмат і шмат мастакоў.*
*Краявіды цудоўныя ў прыбярэжнай прыродзе*
*Можна бачыць, вандруючы на цеплаходзе*
*Па Дняпры, што цячэ аж да мора спрадвеку.*
*Вы легенду пачуеце тут пра Машэку*
*І пра тое,як горад узнік на Дняпры.*
*На яго паглядзець прыязджайце, сябры!*

*Несцерава Марыя Алегаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “ВПК дзіцячы сад – сярэдняя школа № 42 г. Магілёва”*

## *Горад на Дняпры*

*Аднойчы я прайшла па Магілёве*
*І шмат пабачыла цікавага, сябры.*
*Ці хопіць слоў у беларускай мове,*
*Каб расказаць пра горад на Дняпры,*
*Каб распавесці пра падзеі віры,*
*Што ратуша трывала пяцьсот год,*
*Што назаўжды запомніў мой народ?*
*На ратушы штораз гадзіннік б'е…*
*І мастакі малююць на паштоўках,*
*Як Магіслаў з'яўляецца ў акне,*
*Каб, горад свой пабачыўшы з узгорка,*
*Нам нагадаць, што час ідзе таропка.*
*Затым пайшла я па музеях, дружа.*
*Там пабываць заўжды цікава дужа.*
*Вось той музей – якраз пра горад мой,*
*Пра побыт наш у розныя стагоддзі,*
*Пра кожны зрух, пра кожны бой, пра той*
*Дух славы, што няспынна карагодзіць*
*Штодзень усіх у чарадзе падзей:*
*І добрых, чулых, і зусім благіх людзей.*
*Мой шлях ляжаў да Буйніцкага поля,*
*Дзе адбываўся бой за горад Магілёў.*
*Тут мужна так абаранялі волю,*
*Што не забыць праз тысячу гадоў!*
*Шануе горад памяць тых сыноў,*
*Яны змагаліся за наш спакой.*
*Ты памятай герояў, сябар мой!*
*Музеі, помнікі, лясы, крыніцы…*
*Бульвары, плошчы, паркі і масты…*

*Мой горад лепшы ў свеце! Не забыцца,*
*Што толькі тут душа мая іскрыцца!*

*Аніськова Анастасія Вячаславаўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 3 г. Магілёва”*

## *Маленькая Радзіма*

*Мая маленькая Радзіма,*
*Мой родны горад на Дняпры…*
*Гляджу адкрытымі вачыма –*
*Хто прыгажосць гэту стварыў?*

*З гары Машэкі пазіраю –*
*І бачу Падніколля цуд…*
*Спушчуся – гонар захапляе:*
*Фантаны, дрэвы, лаўкі тут.*

*Сваю маленькую Радзіму,*
*Свой любы чысты Магілёў*
*У жыцці ніколі не пакіну,*
*Аддам яму сваю любоў…*

*Брытаў Уладзіслаў Аляксандравіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва”*

## *Мова жыцця*

*Я – грамадзянін Беларусі,*
*Я – прадстаўнік пакалення,*
*Я – стваральнік будучыні,*
*Я – той, у каго запытаюць*
*І дзеці, і ўнукі:*
*"Чаму без прынукі*
*Мову сваю занядбалі, стапталі,*
*Купалу і Коласа не паважалі?*
*Не ведалі песень і казак чароўных,*
*Тых, што крыніцай здароўя лічылі,*
*На якіх гадаваліся і раслі мы?"*

*Вучылі англійскую,*
*Вучылі французскую,*
*Вучылі суседнюю, рускую,*
*А сваю, беларускую,*
*На потым заўжды адкладалі,*
*Ды сэрцам яе да канца не спазналі.*

*Гісторыя нас яшчэ не навучыла,*
*Што мову забыўшы, страчваеш сілу?*
*Забылі на строгі бацькоўскі наказ,*
*Што рукі складаць не прыйшоў яшчэ час!*

*І тады заварушыцца наша сумленне,*
*Ды каб не было беззваротным спазненне.*
*Каб мова на ніве жыцця зака*

*Дзядзюля Аліна Уладзіміраўна*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва"*

## *Адзіная мая*

*Дзень добры, мова мілая,*
*Дзень добры, мова сціплая,*
*Дзень добры, непаўторная,*
*Ласкавая, шыкоўная,*
*Выразная, цукровая,*
*Сардэчная мая!*

*Вітаю мову слаўную,*
*Па зернейку сабраную,*
*Крывёй дзядоў палітую,*
*Народжаную працаю,*
*У душах уваскрэслую,*
*Наноў адбудаваную,*
*Цяплом сыноў спавітую.*

*Вітаю цябе з радасцю,*
*Квяцістую, узнёслую,*
*Да іншых непадобную,*
*Іскрыста-меладычную,*
*Такую галасістую,*
*Крынічную, гаючую,*
*Шчасліва-летуценную,*
*У жыцці маім адзіную!*

*Дзень добры, мова родная,*
*Дзень добры, мова годная,*
*Дзень добры, сакавітая,*
*Слязой вякоў абмытая,*
*Празрыстая, любімая,*

*Такая самавітая,*
*Трывушчая, адданая,*
*Любоўю продкаў тканая,*
*Адзіная мая!.*

*Церахава Маргарыта Паўлаўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва”*

## *Роздум пра родную мову*

*Мяне ўсе называюць беларускай.*
*Я ганаруся дзіўным родным краем,*
*А размаўляю я часцей па-руску,*
*Хоць мову родную таксама маю.*

*І крыўдна часам мне ў душы бывае,*
*Што, захапіўшыся замежнай мовай,*
*Як трэба сваю родную не знаем,*
*Не цешымся яе напеўным словам.*

*Калісь мы зваліся Вялікім княствам*
*І мову продкі шчыра шанавалі.*
*На ёй вялося ўсё заканадаўства,*
*І нараджаліся з ёй, і паміралі.*

*На ёй гучалі словы прывітання,*
*І запрашэнне госця на пастой.*
*На ёй кляліся хлопцы ў каханні,*
*Лічылі знічкі летняю парой.*

*Але мацнела злоба ў чужынцаў,*
*Расло жаданне край мой захапіць,*
*Зрабіць прынадным для сябе гасцінцам,*
*А мову маю знішчыць, спапяліць.*

*Яе вякамі нішчылі, таптаі,*
*Чынілі здзекі і рабілі зло…*
*А мова засталася ўсё ж жывая,*
*Як сонца незгасальнае святло.*

*Яна жыве ў чмяліным карагодзе,*
*Світанкамі прыходзіць на зямлю,*
*Вясёлкаю над лугам узыходзіць*
*І зернеткам лажыцца на зямлю.*

*Мне продкам «дзякуй » хочацца сказаць,*
*Што  я заўсёды побач з мовай рускай*
*Магу на роднай думаць і пісаць.*
*Бо нездарма ж завуся беларускай!*

*Самкова Да'я Аляксееўна,*
*вучаніца Х класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 13 г. Магілёва"*

## *Родная мова*

*Разбегліся думкі, пакінулі словы,*
*І мысліць па-руску ўжо мы гатовы...*
*Чакай, беларус! Не губляй сваёй мовы:*
*У ёй гаваркія, ласкавыя словы.*

*Нідзе не пачуеш ты «краска», «вясёлка»...*
*Узнімі галаву, бачыш: свеціць там «зорка»,*
*А ў полі красуе патрэбная «зёлка»...*
*І стане табе адразу так горка,*

*Што мусіш згубіць сваю родную мову.*
*А яе ж ты павінен прыняць за аснову...*
*Дарэмна хінешся к чужому нам слову.*
*Любі, беларус, беларускую мову!*

*Волкава Аліна Васільеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 38 г. Магілёва”*

## *Беларуская мова*

*Прыгожыя гукі,*
*Цудоўныя словы,*
*Як матчыны рукі*
*Прылашчыць гатовыя.*
*Яскравыя выразы,*
*Мудрасці поўныя,*
*У памяць нанізаны –*
*Змалку запомніла,*
*Як маці спявала*
*Ў цёмнае ночы,*
*Мяне калыхала,*
*Заплюшчыўшы вочы.*
*І гукі ліліся*
*Ў прыгожыя словы*
*Так мала вядомай мне*
*Роднае мовы!*
*Я вывучу хутка*
*І буду спяваці,*
*Як на беларускай*
*Спявала мне маці.*
*Прыгожыя гукі,*
*Цудоўныя словы -*
*То з лепшай навукі!*
*То з роднае мовы!*

*Шынкарэнка Маргарыта Сяргееўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 25 г. Магілёва"*

## *Што гэта такое – роднае слова?*

*Што гэта такое –*
*Роднае слова?*
*У ім уся Радзіма*
*Наша і мова,*
*У ім голас матулі*
*Адзінай у свеце,*
*Жытнёвае поле,*
*І рэчка, і вецер.*
*Шум дождажыку ў лесе*
*І грому раскаты…*
*Чароўны мой край,*
*Ты на казкі багаты!*
*На добрых людзей,*
*Працавітых і дружных,*
*Шчырых з сябрамі,*
*А з ворагам мужных.*
*Хачу я прызнацца*
*Сваёй Беларусі:*
*“Цябе я люблю*
*І табой ганаруся!”*

*Раманенка Паліна Андрэеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 2 г. Магілёва”*

## *Наша мова не загіне!*

*Шмат моў існуе на планеце…*
*У кожнай краіне свая.*
*Яны  нібы кветкі ў букеце…*
*За ўсе ж даражэй мне мая!*
*Мая, бо з дзяцінства я чула,*
*Як маці спявала заўжды,*
*З усмешкай мяне калыхала*
*І нешта шаптала тады.*
*Шаптала пяшчотныя словы,*
*Вучыла нас мову любіць,*
*За роднае слова трымацца самому,*
*Вучыла з павагай нас жыць.*
*І зараз маці ўсміхнецца,*
*Гаворыць: ,,Добры дзень, сям'я!"*
*Мацней сардэчка ўраз заб'ецца:*
*Вось наша мова, вось яна!*
*,,Мамуля, мамачка, матуля,-*
*Скажу на роднай мове я.-*
*Сястрычка, татачка, бабуля…*
*Усе разам мы – адна сям'я!"*
*Жывём у лепшай мы краіне,*
*Спакой і мір мы беражом!*
*І наша мова не загіне,*
*Бо ў сэрцы гонар мы нясём!*

*Вароніна Ганна Сяргееўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 22 г. Магілёва"*

## *Слова пра мову*

*Жыву з нараджэння ў маёй Беларусі*
*І гэтай зямлёю заўжды ганаруся.*
*Прыемныя твары, усмешкі людзей…*
*Вось мова яшчэ каб гучала часцей!*

*Забыліся мову, культуру, сябе!*
*Акажамся ў брудзе, у мокрай градзе!*
*Мне сорамна, страшна, я вельмі баюся,*
*Што мову забылі ў маёй Беларусі…*

*Я шчыра сябрую з любым іншаземцам,*
*Ды ён – гэта ён, а не мы, думай сэрцам.*
*І дрэвы, і сцежкі мне штосьці шапочуць,*
*Яны з ім пайсці нікуды не хочуць.*

*З любоўю да роднага слова, да вас*
*Я ўсім нагадаю пра еднасць для нас:*
*Шануйце радзіму і мову ўвесь час!*

*Майстрова Ніна Андрэеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 3 г. Магілёва”*

## *Наша мова*

*Наша мова – найпрыгажэйшая ў свеце.*
*Ведаюць аб гэтым і дарослыя, і дзеці.*
*Меладычная, пявучая, павольная,*
*Як люстэрка беларускага народа вольнага.*

*Увабрала гул лясоў, дубоў, лугоў.*
*Ветрык, што снуе паміж стагоў,*
*Спевы птушак і духмяны пах зямлі,*
*Пах квітнеючых палёў, узаранай раллі.*

*Наша мова – гэта памяць, і гісторыя, і слава,*
*Гэта тое, з чым я свет жыцця пазнала,*
*Гэта розум, вопыт, прыгажосць і сіла,*
*Тое, што майму так сэрцу міла.*

*Гэта матчына пяшчота і любоў,*
*Гэта гонар за дачок і за сыноў,*
*Што па свеце край наш праслаўляюць,*
*Станаўленню Беларусі ўсё жыццё спрыяюць.*

*Наша мова дапаможа нам заўсёды:*
*І ў сяброўстве, і ў каханні, і ў нягодах.*
*Стужкаю квяцістай побач з намі ўецца.*
*Скарба большага няма ў свеце, мне здаецца.*

*Многа раз яна між іншых памірала,*
*У забыцці народным моцна гаравала,*
*Але ж выстаяла, адрадзілася ў сэрцах,*
*Праз гады над краем звонкай песняй льецца.*

*Як мастак з мінулага ў сучаснасць,*
*Наша мова – гэта наша шчасце.*
*Неацэнны скарб, духоўная магутнасць*

*Веранёва Вераніка Уладзіміраўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва”*

## Бабулечка мая

*Мама з татам на рабоце,*
*А з бабуляй дома я.*
*Не сядзім мы ў турботе,*
*Ты ж – прыдумшчыца мая!*

*То маўчыш, то заспяваеш,*
*Казку скажаш пра катка.*
*Ты мяне не праганяеш,*
*Ты – сяброўачка мая!*

*Нават з цяжкаю задачкай*
*Да цябе звярнуся я.*
*Маме з татам часу мала,*
*Ты ж –разумніца мая!*

*Вельмі я люблю аладкі,*
*А бліночкі – удвая!*
*Дай муку са шчочкі вытру,*
*Гаспадынька ты мая!*

*Хутка дзень тваіх народзін,*
*І збярэцца ўся сям'я.*
*Я партрэт твой намалюю,*
*Прыгажунечка мая!*

*Шайкова Юлія Дзмітрыеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва"*

## *Мая вёска*

*Есць пад Магілёвам месца,*
*Больш за ўсе яго шаную.*
*Там маё спявае сэрца,*
*Пра яго вам раскажу я.*

*Гэта вёска-невялічка…*
*У Беларусі такіх шмат.*
*Расцягнулася ўздоўж рэчкі…*
*І схавалася ў лясах.*

*У тых лясах не нагуляцца,*
*Не надыхацца ніколі;*
*У малахітавым убранстве*
*Там вакол гуляе воля.*

*І празрыстыя далоні,*
*У першазданным харастве,*
*Вам працягне рэчка Проня,*
*Што спрадвеку тут цячэ.*

*Ёсць яшчэ там луг шырокі,*
*Вокам што не абвясці-*
*Мілы  рай для жаб і птушак*
*І для іншай жыўнасці.*

*А галоўнае багацце*
*Нашай вёскі – дабрыня.*
*Тут заўжды пануе шчасце,*
*І спакой, і цішыня.*

*І са шчырым сэрцам людзі*
*Вас сустрэнуць, як сяброў.*
*Вось чаму сюды вяртацца*
*Я хачу і зноў, і зноў.*

*Баранкова Дзіяна Андрэеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 37 г. Магілёва"*

## *Слова аб настаўніку*

*Чалавек пакідае рознае:*
*Вершы, рэчы, сваіх дзяцей,*
*Кнігі, запісы, песні слёзныя,*
*А Настаўнік – проста Людзей.*
*І ацэняць яго, я думаю,*
*Па тых вучнях, што ў свет ён пусціў,*
*Па іх талентах, па іх здольнасцях,*
*Што Настаўнік знайшоў і развіў.*
*І падзякаю будзе лепшаю*
*За бяссонніцу, неспакой,*
*Калі дзеці ў турботах, клопатах*
*Успамінаць яго будуць парой.*
*Ад Вас не пачуеш папрокаў,*
*Крыку, злосці і чорнай маны.*
*І ў жыцці сваім першыя крокі*
*Разам з Вамі рабілі і мы.*
*Разам з Вамі мы спрабавалі*
*Першы поскрып пяра на лісце,*
*Разам з Вамі адказу чакалі,*
*Захапляліся: вішня цвіце.*
*Я схіляюся нізка-нізка*
*І ўдзячная без канца*
*Вам, Настаўніку ад калыскі,*
*Вам, Настаўніку ад жыцця.*

*Старыкава Марыя Паўлаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 37 г. Магілёва”*

## Мы любім край наш дарагі!

*Мы любім край наш дарагі,*
*І ў квецень любім, і ў снягі.*
*Тут сэрцу родныя нам хаты,*
*А ў пушчах скачуць зубраняты.*

*Мы любім нашы рэчкі, нівы,*
*Птушыных песень пералівы,*
*Над лугам яркіх матылькоў*
*І вочкі сініх васількоў.*

*Мы любім герб сваёй краіны:*
*Тут кветкі льну і канюшыны,*
*А промні сонейка так ззяюць –*
*Увесь шар зямны сагрэць жадаюць!*

*Хай працвітае край наш родны,*
*Шчаслівы будзе і свабодны!*
*Хай кожны край наш праслаўляе,*
*А войн ніколі не бывае!!!*

*Волкаў Мікалай Аляксандравіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва”*

## *Наша Беларусь*

*Жыта залатое*
*ветрык калыхае,*
*а над полем бусел*
*крылы распраўляе.*

*Кветкі - васілёчкі*
*ў неба паглядаюць,*
*сіненькія вочкі*
*ўсіх гасцей вітаюць.*

*Пушча, зубры, бульба*
*і народ гасцінны…*
*Усё гэта пабачыць*
*кожны з нас павінны!*

*Гэтым простым скарбам*
*шчыра ганаруся.*
*Ён завецца проста -*
*нашай Беларуссю!*

*Каліна Аліна Алегаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва”*

**Беларусь**

*Я люблю сваю старонку,*
*Лесу шум, звон ручая,*
*Птушак спеў вясёлы, звонкі,*
*Беларусь – любоў мая.*

*Я люблю лугі, азёры,*
*Па-над рэчкай туманы,*
*Ночкай цёмнай, у небе зоры*
*І сівыя курганы.*

*Я люблю сваю Радзіму,*
*Кожны бусел тут – сваяк,*
*Край мне мілы, край адзіны,*
*Беларусь – зямля мая.*

*Сіманенка Сцяпан Дзмітрыевіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Гімназія № 4 г. Магілёва"*

## *Мой тата*

*Мой тата – супрацоўнік*
*Службы МНС.*
*Як увечары ён з намі,*
*Для ўсёй сюм'і прагрэс.*

*Ён можа быць на працы*
*І ўдзень, і ўначы,*
*Калі ёсць неабходнасць*
*Людзям дапамагчы.*

*З самай цяжкай праблемай*
*Ён справіцца заўжды*
*І зберажэ любога*
*Ад гора і бяды.*

*Пажар, выбух, паводка –*
*Умчыць яго разлік.*
*Быць раўнадушным, чэрствым*
*Мой тата не прывык.*

*За мужнасць і адвагу*
*Пры барацьбе з агнём*
*Яго ўзнагародзілі*
*Працоўным медалём.*

*Я ганаруся татам.*
*Малюся ўначы.*
*Прашу я Бога тату*
*Ад бед засцерагчы.*

*Яго чакаем дома*
*Маці, сястра і я.*
*Пра нас суседзі кажуць:*
*“Мы - дружная сям’я”.*

*Вараб’ёва Варвара Раманаўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 4 г. Магілёва”*

## *Родны край*

*Шум дуброў і лясоў,*
*Салаўіны напеў.*
*З каласісітых палёў -*
*Ціхі ветру павеў.*

*Ты мой край сінявокі,*
*Дзе чаромха цвіце,*
*Дзе ў прасторы аблокаў*
*Белы бусел плыве.*

*Дзе пад гоман крыніц*
*Мне так хочацца пець,*
*Дзе пад успышкі зарніц*
*Шчасце хочацца мець.*

*Мілы край, дарагі!*
*Ты заўсёды са мной.*
*І дарогі-шляхі*
*Усе вядуць за табой.*

*Бацяшына Ева Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 4 г. Магілёва"*

## *Я жыву ў Беларусі*

*Я жыву ў Беларусі -*
*Гэта родны мой край.*
*Я табой ганаруся,*
*Мой бярозавы гай.*

*Тут так гучна спявае*
*Салавей на зары.*
*І зусім не змаўкае*
*Зычны смех дзетвары.*

*Сонца ясна тут свеціць,*
*У зорках неба блішчыць.*
*Каб дарослым і дзецям,*
*Было весела жыць.*

*Я жыву ў Беларусі*
*І шчаслівая тут.*
*Я табой ганаруся,*
*Непаўторны мой кут.*

*Баліна Таісія Анатольеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 13 г. Магілёва”*

## *Зіма*

*Вось дык цуда, вось дык цуда!*
*У наш край прыйшла зіма –*
*Стала ціха ў кватэрах,*
*Бо дзяцей там ужо няма.*

*Хто на лыжы, хто на горку,*
*Хто ў снег з разгону прыг.*
*Толькі і чуваць знадворку*
*Крык і смех сяброў маіх!*

*Мне таксама не сядзіцца,*
*Я за санкі – і на двор.*
*Буду з горачкі катацца*
*Аж да самых першых зор.*

*А як надакучыць горка,*
*Пабудуем крэпасць мы.*
*Як жа робіцца салодка*
*Нам ад сёлешняй зімы!*

*Кайданаў Мікіта Аляксеевіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва"*

## Акрабатыка

*Я яшчэ малы хлапчук,*
*Але маю моцны дух.*
*Маю я імкненне – акрабатам стаць,*
*Каб без крылаў у паветры лятаць.*
*Разбег, рандад, узлёт – і затрымцела сэрца на імгненне.*
*Ляціш, не адчуваючы зямнога прыцягнення.*
*Якая сіла, спрыт і прыгажосць у піруэце,*
*Кульбіт наперад, разварот – і ты ўжо ў вамсэце.*
*Скачкі, падзенне, фляг і перакаты,*
*Кручэнне целам без апоры і шпагаты.*
*Такі вось спорт за гранню разумення,*
*У ім я адчуваю духоўнае задавальненне.*
*Такому спорту прысвяціць сябе хачу я,*
*Каб праз гады вялікіх трэніровак усім на дзіва*
*Узысці на п'едэстал, падняць угору алімпійскі вымпел*
*І закрычаць: "За сінявокую краіну, за прыгажуню –*
*Беларусь!"'*

*Кузняцоў Міхаіл Сяргеевіч,*
*вучань IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва"*

## *Зімовыя святы*

*Снежная мяцеліца*
*Да нас, дзяцей, прыйшла.*
*Новы год з Калядамі*
*У хату прывяла.*

*Чакалі падарункі мы –*
*І Дзед Мароз прынёс.*
*Усё, што загадалі мы, –*
*І цацак цэлы воз!*

*Бабуліны аладкі*
*Запомню назаўжды.*
*Зімовыя калядкі*
*І з масліцам бліны.*

*Кусянкоў Аляксей Яўгеньевіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва”*

## *Беларусь*

*Пад крылом буслiным*
*Сiнявокi край…*
*Водарам малiны*
*Лета сустракай!*
*Жоўтыя палеткi*
*З зелянiнай дрэў.*
*На лужайцы – кветкi,*
*Птушак звонкi спеў…*
*З сiнiмi вачамi*
*Дзецi тут жывуць.*
*Здагадайцесь самi,*
*Як жа iх завуць?*
*Валасы бялюткiя,*
*Нiбы дзмухавец,*
*А да справы хуткiя:*
*Кожны маладзец!*
*Роднай мовы гукi:*
*Мацi спеў вяла.*
*Над калыскай рукi,*
*Нiбы два крыла…*
*Цiхi матчын голас,*
*Павуцiнне сноў…*
*У полi – жытнi колас,*
*Звонкi смех сяброў…*
*Я сваёй краiнай*
*Роднай ганарусь,*
*Што завецца дзiўна,*
*Мiла: Беларусь.*
*Чыстая, як узiмку*

*Чысты першы снег,*
*Цешыцца у абдымках*
*Велічнасці рэк…*
*Родная такая*
*Маці – Беларусь!*
*Я табой заўсёды*
*Вельмі ганарусь!*

*Сіткевіч Паліна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва"*

## *Беларусачка*

*Косы русыя, белая хустачка,*
*Я дзяўчынка беларусачка.*
*Я маленькая ды лагодная,*
*На сваю краіну падобная.*
*Каранёў бацькоўскіх я, кветачка,*
*І расту я ўзімку і ўлетачка.*
*Да сяброў надзейна прытулена,*
*Саграваюся ласкай матулінай.*
*Ад вятроў і нягод прыкрытая,*
*Я расту з бацькоўскай малітваю.*
*Кожны дзень з ранку да вечара*
*Цеплынёй і любоўю асвечана.*
*Я зямля мая - сінявокая,*
*Я гляджуся ў азёры глыбокія.*
*Я вучуся быць памяркоўнаю,*
*Каб любіць магла ўсіх роўна Я.*
*Я — дзяўчыначка беларусачка.*
*Краіны сваёй я душачка.*
*Свеціць сонейка мне цёпленька.*
*Я — дачушка Беларусі родненькай.*
*Вось такая я беларусачка -*
*Косы русыя, белая хустачка.*
*Я прыгожая ды свабодная,*
*На сваю краіну падобная.*

*Канстанціновіч Аляксандра Андрэеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 46 г. Магілёва"*

## *Абяцанне*

*Дарагія нашы ветэраны!*
*Многа хочацца мне вам сказаць.*
*Крыху загаіць цяжкія раны,*
*Каб маглі спакойна ноччу спаць.*

*Мы ўстанем перад вамі на калені,*
*Каб удзячнасць нашу перадаць.*
*Каб не толькі наша пакаленне*
*Жах вайны змагло не забываць.*

*Калі будзем ведаць хуткасць кулі.*
*То ніколі не дапусцім мы вайны.*
*Каб спакойны былі ўсе матулі,*
*Што не пойдуць на вайну сыны.*

*За свабоду,за блакіт нябёсаў*
*Мы ўдзячны вам,героі нашы,*
*Бо вайна згубіла столькі лёсаў.*
*Мір –гэта заслуга толькі ваша.*

*Тых, хто сення перад намі.*
*З сівізной, як снег, на галаве.*
*І , канешне, тых , хто ўжо не ўстане.*
*Хто загінуў за Радзіму на вайне.*

*Слова дзякуй- гэта вельмі мала*
*Што мы можам сёння Вам сказаць,*
*Вас Радзіма ў цяжкі бой пазвала,*
*Каб жыццё змаглі  Вы нам падараваць.*

*Вам жадаем моцнага здароўя.*
*Каб вы жылі доўга, радавалі нас,*
*Каб не толькі ў святочны дзень,з любоўю*
*Прымалі кветкі і ўдзячнасць кожны час.*

*Ну а мы даём вам абяцанне,*
*Не забудзем пра ваш подзвіг кожны міг.*
*Скажам мы, прачнуўшысь кожным раннем:*
*“Памятаем мёртвых – беражом жывых!”*

*Вяруціна Ульяна Мікалаеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 5 г. Магілёва”*

## *Зімовыя забавы*

*Ой, зіма, зіма прыйшла!*
*Дзецям радасць прынясла!*
*Павыскоквалі яны*
*У прыгожыя двары.*

*Хтосьці цягне санкі,*
*Хтось нясе лядзянкі.*
*Побач за ўзгоркам*
*Чакае сяброў горка!*

*Некаторыя ў двары*
*Лепяць снежныя дамы.*
*Гуляюць дружна ў снежкі.*
*На тварах іх усмешкі.*

*Эх, зіма, зіма, зіма!*
*Ты цудоўная пара!*
*Зажурылася дзятва,*
*Бо дамоў усім пара.*

*Палазкова Лізавета Мікалаеўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва”*

## *Мая Радзіма*

*Радзіма – гэта лес і гай,*
*Дзе бусел пралятае,*
*Дзе сонца свеціць нам ярчэй*
*І гром грукоча ў маі…*

*Тут птушка з птушкай размаўляе,*
*Над нівай – неба зоркай ззяе,*
*Рака цячэ, бурліць ручай…*
*Ты лепей края не шукай!*

*Мая Радзіма – Беларусь,*
*І вельмі ёй я ганарусь!*
*Тут нарадзіўся і жыву,*
*Люблю краіну я сваю!*

*ДзегцяроўСтаніслаў Ігаравіч,*
*вучань ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва”*

## *Мая Беларусь*

*Край блакітных азёр,*
*Хуткіх рэчак глыбокіх.*
*Гэта ўсё – мая Беларусь!*

*Мноства пушчаў, лугоў,*
*Залацістых палёў.*
*Ты – любоў мая, Беларусь!*

*Лес, бярозавы гай,*
*Белавежскі наш край.*
*Гэта наша зямля – Беларусь!*

*Продкаў спадчына адзіная,*
*Назаўсёды сэрцу мілая.*
*Ганаруся табой, Беларусь!*

*Шэйман Ксенія Дзянісаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 11 г. Магілёва”*

## *Карагод*

*Апранулі елачкі*
*Зялёныя сукеначкі*
*Снежнага фасону,*
*Зімовага сезону.*

*Стромкія бярозы*
*Ззяюць ад марозу,*
*Футры снежныя надзелі,*
*У люстэрка паглядзелі.*

*Вось такія паненачкі,*
*Бярозы ды елачкі,*
*Сталі дружна ў карагод,*
*Таньчыць будуць без турбот.*

*Як прыгож зімовы бор,*
*Быццам гэта царскі двор!*
*Галінкі, лапкі пераліваюцца,*
*Нібы дрэвы ўсміхаюцца.*

*Зяткіна Ксенія Віктараўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва"*

## *Беларусь – мая Радзіма*

*Беларусь – мая Радзіма,*
*Мой сэрдцу мілы закуток.*
*Цябе люблю я шчыра-шчыра,*
*Я тут зрабіла першы крок.*

*Твае блакітныя азёры,*
*Як думкі светлыя душы,*
*Мне баюць казкі ў вячоры,*
*Мяне баюкаюць у начы.*

*А вецер легкі будзіць рана*
*І я бягу хутчэй на двор.*
*А там лугі, палі, сцяжынкі*
*І ў гары сасновы бор.*

*Я, маленькая дзяўчынка,*
*Заўсёды мару, што зраблю:*
*Твой светлы вобраз для нашчадкаў*
*Абавязкова зберагу!*

*Новікава Улада Дзмітрыеўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва"*

## *Мая зямля*

*Мая зямля…Мая Радзіма -*
*Дзяцінства мілы мой куток.*
*Тут чула матчыны я песні,*
*Зрабіла першы ў жыцці крок.*

*Тут толькі родныя мясціны.*
*У гаі крынічанька шуміць.*
*Жаўрук у паднябессі сінім*
*Мільёнамі званкоў звініць.*

*Яе ніколі не забуду,*
*Пакіну ў  сэрцы назаўжды.*
*У снах сюды прыходзіць буду,*
*І будзе памяць аб ёй жыць.*

*Забыць той край, дзе нарадзіўся,-*
*То, значыць, здрадзіць караням.*
*Любі куток, у якім з'явіўся*
*І будзь удзячны ты дзядам.*

*Манкевіч Кіра Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 27 г. Магілёва"*

## *Першы снег*

*Першы снег! Першы снег!*
*Як чакалі цябе ўсе!*
*Аж да раніцы мяло,*
*Белым стала ўсё сяло.*

*Чыстай коўдрай засцяліла*
*Зямлю-матухну зіма.*
*Снежную сваю пярыну*
*Ўзбівала ноч сама.*

*Усё вакол святочным стала,*
*А малым і гора мала:*
*Імчаць дзеці на санях.*
*Колькі радасці ў вачах!*

*Першы снег! Першы снег!*
*Цуда! Радасць! Гоман! Смех!*

*Печурычка Марыя Максімаўна,*
*вучаніца III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва”*

## *Што раблю ў школе я?*

*Што раблю ў школе я?*
*Адкажу вам хутка.*
*Мы ж тут – як адна сям'я.*
*Слухай вельмі чутка.*
*Пачынаецца ўсе зранку:*
*Кожны весяліцца.*
*Сустракае нас на ганках*
*"Мама - чараўніца".*
*Зазвініць званок вясёла –*
*Сядуць усе за парты.*
*"Мама" паглядзіць наўкола:*
*- Хто на што з вас варты?*
*Фарбамі заззяюць вочы:*
*"Новае заданне!"*
*Кожны "брат" адзнаку хоча*
*- Што ж там за пытанне?*
*Раз – адказ! Другі - адказ!*
*Усміхнецца "мама".*
*- Вельмі добры ў мяне клас.*
*- Ты ў нас таксама!*
*Пройдзе дзень як дзве хвіліны.*
*Толькі ж дома снедаў!*
*Заўтра "мама" зноў сустрэне,*
*Павядзе да ведаў…*

*Сацура Глеб Русланавіч,*
*вучань III класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва"*

## *Зіма ў вёсцы*

*Раніцай прачнуся, пагляжу ў акенца.*
*Як наўкол прыгожа! Сэрца хутка б'еццa.*
*Што ты нарабіла, чараўніца-зімка?!*
*Снегам упрыгожыла кожную галінку.*

*Хутка апрануся і хапаю санкі...*
*Ды бягом да рэчкі - горка там, каўзанка.*
*Панясуцца з горкі санкі-самакаты.*
*Стомленая, у снезе прыпаўзу да хаты.*

*Стрэне мяне бабка, абмяце анучай*
*Скажа: "Ідзі ўжо снедаць, любая ўнуча! "*
*Ах, якія смачныя бліны маёй бабулі!*
*Ды пара ўжо ад'язджаць - кончыліся гулі.*
*Зноўку мне ў школу - набірацца ведаў.*
*На канікулы вясной я к табе прыеду.*

*Якавіцкая Паліна Томасаўна,*
*вучаніца IV класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 43 г. Магілёва"*

## *Школа*

*Што такое школа?*
*Што гэта за месца?*
*Дом стаіць прыгожы.*
*Ёсць там шмат акенцаў.*

*Ходзяць туды дзеці,*
*Цягнуць ранец цяжкі.*
*Хоць ён невялікі,*
*Але вельмі важкі.*

*Не, зусім не есці,*
*Не гуляць у цацкі.*
*Ходзяць туды дзеці,*
*Цягнуць ранец цяжкі.*

*У гэтым ранцы кніжкі-*
*Вось чаму ён цяжкі!*
*Сшыткі і алоўкі,*
*Ну  і трошку цацкі.*

*Ходзяць сюды дзеці,*
*Для таго, каб потым,*
*Стаць разумным, верным,*
*добрым і турботным.*

*Тут навучаць усіх пісаць,*
*Хутка бегаць, памнажаць.*
*Маляваць, чытаць, рашаць*
*Зможаш шмат чаго пазнаць!*

*Школа - будзе промнем,*
*Шляхам у падарожжа,*
*І адчыніць  дзверы*
*Ў навакольны свет.*

*Будзеш помніць вечна*
*Лепшае сяброўства,*
*Першае каханне*
*І вяселы смех!*

*Якімовіч Лізавета Філіпаўна,*
*вучаніца ІІІ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва”*

## *Родная краіна*

*Чыстыя палеткі,*
*Ля дарог – буслянкі,*
*Свет купальскай кветкі*
*Росным ціхім ранкам.*
*Сонечныя сцежкі,*
*Вечар салаўіны,*
*Васількі на ўзмежку –*
*Вось мая краіна.*
*Ціхія дубровы,*
*Светлыя крынічкі,*
*Часам вечаровым*
*У небе зоркі-знічкі.*
*У лузе ручаіна,*
*Жаваранак звонкі –*
*Вось мая краіна,*
*Родная старонка.*
*Залатое збожжа,*
*Дабрыня людская,*
*Дробны цёплы дожджык*
*Над зялёным маем.*
*Прыказкі бабулі,*
*Ясны смех дзяўчыны –*
*Вось наш дом агульны,*
*Родная краіна!*

*Далімаева Таццяна Андрэеўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 40 г. Магілёва"*

## *Зімовыя канікулы*

*Канікулы канчаюцца,*
*Сумотна на двары.*
*- Збірацца трэба ў школу,*
*Партфель ідзі складзі! -*
*Сказаў мне гэта тата.*
*-Ну, што ж, іду-іду,*
*Вазьму свае алоўкі,*
*Падручнікі збяру!*
*Тут глянула ў акенца:*
*-Ура! Ура! Ура!*
*Кругом зямля бялюткая!*
*Навокал уся дзятва!*
*Усе радуюцца снегу,*
*А снег - з усіх бакоў!*
*Адны будуюць горку,*
*А хто - снегавікоў!*
*Бягуць на лыжах дзеці*
*І саначкі вязуць,*
*Сняжкі лятуць навокал,*
*Не звернеш - пападуць.*
*Ну, вось зіма вярнулася,*
*Ішла, відаць, здалёк.*
*Канікулы працягнуцца*
*Яшчэ адзін дзянёк!*

*Маёрава Мілана Аляксееўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа № 42 г. Магілёва"*

## *А ў нас на Каляды*

*Бліны з верашчакай, сыры, смажаніна,*
*У маці – спадніца, кашуля – у сына.*
*Сям'я апранула такое адзенне,*
*Што сэрца зайшлося ад захаплення.*

*На покуць паставілі збожжа ў свята,*
*Каб год атрымаўся надзвычай багаты.*
*На стол, пад святочны бялюткі абрус,*
*Трошачкі сена паклаў беларус.*

*Зараней паправілі ўсё, што зламалі.*
*Прышылі, прыбілі, памылі, звязалі.*
*Малы і дарослы вячэру чакае,*
*Бо хутка на небе зорка заззяе.*

*Грыгор'ева Анастасія Уладзіміраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 15 г. Магілёва"*

## *Пра шчасце*

*Калі хто спытае парою:*
*“Якое яно шчасце людское?”*
*То я адкажу вам адразу,*
*Што шчасце быць з мамаю разам!*

*Шчасце - каб былі здаровыя дзеці,*
*Шчасце - каб мір быў ва ўсім белым свеце,*
*Шчасце - каб шчырыя словы гучалі,*
*Шчасце - каб жыць без тугі і адчаю!*

*Шчасце – у мірнай краіне радзіцца,*
*Шчасце – на гэтай зямлі прыгадзіцца,*
*Шчасце – каб побач сяброў карагоды,*
*Шчасце – каб дружба і мір быў заўсёды!*

*Таму, беларусы, шчаслівыя людзі,*
*Бо ў міры і згодзе жывём і жыць будзем!*

*Дорахава Сафія Аляксандраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 32 г. Магілёва”*

## *Цудоўная пара*

*Нарэшце дачакаліся…*
*Прыйшла да нас зіма.*
*Прыгожая, цудоўная,*
*Святочная пара!*
*Хоць Новы год без снегу*
*Мы сустракалі зноў,*
*Затое студзень радуе*
*Нас беленькім сняжком.*
*Мароз усё мацнее,*
*Кранае шчокі, нос.*
*І рукі анямелі…*
*Балюча аж да слёз!*
*Залазіць ён пад шапку, пад шалік, за каўнер,*
*Кусае рукі, ногі,*
*Нібы драпежны звер.*
*Але нясуся з горкі*
*І маме я крычу:*
*“Я трошкі пагуляю.*
*Дамой йшчэ не хачу!”*
*А мама мне ўсміхнецца*
*Прыгожымі вачамі.*
*І падаюць сняжынкі*
*На вейкі проста маме.*

*Грышкіна Таісія Аляксандраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 3 г. Магілёва”*

## *Зімка-чараўніца*

*Раніцай я ўстала*
*І гляджу ў акно:*
*Усё вакол бялютка,*
*Быццам серабро.*

*Снег лёг на галіны,*
*Шапкі на сасне.*
*Елкі-прыгажуні,*
*Бы нявесты ўсе!*

*Бяры санкі хутка*
*І бяжы на лёд,*
*Дзятва там гуляе,*
*Водзіць карагод.*

*Весела смяюцца,*
*Скачуць і пяюць,*
*Бабу разам лепяць,*
*Гутаркі вядуць.*

*Зімка-чараўніца*
*Пануе смела тут,*
*Нібы гаспадыня,*
*Прыбрала родны кут.*

*Васілеўская Аляксандра Яўгеньеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Магілёўская гарадская гімназія № 1”*

## *Мая Радзіма*

*Мая Радзіма – беларускі край!*
*Жытнёвы колас у бязмежным полі.*
*Лес старажытны і бярозак гай.*
*Мясцін мне гэтых не забыць ніколі!*

*Мая Радзіма – беларускі край!*
*Над хатай бусел зноў гняздо майструе.*
*Я разам з маці, месяц май…*
*Дзяцінства памяць моц жыцця гартуе.*

*Мая радзіма – беларускі край!*
*Духмяны хлеб, што быў сабраны ў полі.*
*Сям'я ўся разам – вось ён, рай!*
*Хвілін мне гэтых не забыць ніколі!*

*Ягоршын Іван Юр'евіч,*
*вучань V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Магілёўская гарадская гімназія № 1"*

## *Да мілай маці прытулюся*

*Да мілай маці прытулюся –*
*І сонца танчыць сярод хмар,*
*Тчэ залацістыя ўзоры,*
*Лунае песняй сярод мар.*
*Я прытулюся і сцішэю,*
*Бо стане светла ў душы,*
*Адступяць маразы, завеі,*
*Праб'ецца радасць скрозь снягі.*
*Я песню веснюю пачую,*
*Высока-чыстую, без слёз,*
*І дзень свой стомлены закрэслю*
*Рукою матчынай наўскос.*
*Я наталюся родным словам,*
*Гаючай мудрасцю замоў,*
*Азяблы лёс свой адагрэю*
*Агнём матуліных размоў.*
*Я зазірну ў азёры-вочы,*
*У шчасця вечны абярэг,*
*І ўдыхну на поўны грудзі*
*Любоў, адзіную навек!*
*Я палячу высока ў неба,*
*Крыла́мі зоры абаўю,*
*Сярод усіх знайду красуню*
*І імем маці назаву...*

*Ульянава Анастасія Аляксееўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва"*

## *Зімовае*

*Пад чыстым абрусам бялюткіх снягоў*
*Ляжыць неабсяжны загадкавы край.*
*Мільгаюць сняжынкі ў шэрагу сноў,*
*Як зоркі калядныя. Казачнік-бай*
*Віхор то сцішэе, то ўсходзіцца зноў,*
*Завея-матуля свой спеў завядзе…*
*Пад покрывам чыстым заснуў Магілёў…*
*Скаваны Дняпро калыханку пяе*
*Каменьчыкам дробным, крутым берагам,*
*Аснежаным дрэвам ля самай вады,*
*Надзеям людскім і дзіцячым гадам*
*І ў сэрцы маім пакідае сляды…*
*– Ой, люлі, ой, люлі, пабач ты ў сне*
*Ялінкі святочнай сярэбраны ўбор.*
*– Ой, люлі, ой, люлі, дай волю вясне, –*
*Падхопіць нябёсаў прасветлены хор.*
*Я спеў запішу ў святочны альбом,*
*Парадую бацьку, матулю, сяброў:*
*"Сні казкі, Дняпро, пад чароўным ільдом,*
*Сні песні, зямля, пад абрусам снягоў".*
*Лядаш, зноў лядаш…*
*Дрэвы ў снезе стаяць.*
*Сцяжынка, ялінка… Вакол – цішыня.*
*Сняжынкі, як зоры ў небе зіхцяць*
*Пад ліхтарамі… штовечар… штодня…*

*Чахоўская Лізавета Андрэеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва"*

## *Цішыня*

*Ах, якая стаіць цішыня!*
*Снежны лес – зімовая казка,*
*Карункі ценяў на гурбах –*
*Успаміны аб летніх красках.*

*Па дрэвах страляе мароз,*
*Перасвіст снегіроў чую тонкі,*
*На ўскрайку – сямейка бяроз,*
*Ля дарогі – прыбраныя хвойкі.*

*Хай скупая палітра зімы –*
*То не восені фарбаў агонь.*
*А стаіць цішыня такая –*
*Сэрца стук, паверце, чуцён.*

*Паміж дрэваў пятляе лыжня,*
*Побач заяц сляды пакідае…*
*Ах, якая ж ты, маці-зямля!*
*Цішыня тут стаіць такая…*

*Не заўважыць тваю прыгажосць*
*Немагчыма, пажыўшы на свеце.*
*Вельмі трэба – і мне, і табе –*
*Захаваць цішыню на планеце.*

*Кавалеўская Дзіяна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва”*

## *Калыханка*

*Люлі, люлі, дзетка.*
*Падрастае кветка.*
*Стане цесна кветцы –*
*Панясём у сенцы,*
*Вынесем у агарод*
*І пасадзім ля варот*
*На радасць матулі,*
*На ўцеху бабулі.*
*Будзе дзетачка расці,*
*Будзе кветачка цвісці.*
*Сонейка сагрэе,*
*Ягадка паспее.*
*Дзетка наша падрасце,*
*За вароцейкі пайдзе –*
*Паглядзець на белы свет,*
*Каб пазнаць увесь сусвет.*
*Баю-баю, баю-бай,*
*Паглядзі на любы край:*
*У любові, дабраце*
*Кожнае дзіця расце.*

*Ганц Ягор Уладзіміравіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва”*

## *Мой родны край*

*Мой родны край, з табой паўсюдна*
*Хачу я быць, мой дарагі!*
*Заўсёды ў думках ты са мною,*
*З табой няма ў душы тугі!*

*Мой край – бялюткія бярозы,*
*Абапал сіняе ракі,*
*Мой край – блакітныя нябёсы,*
*Зірні вакол ва ўсе бакі!*

*Мой край, люблю твае прасторы,*
*За рэчкай з кветкамі палі.*
*Люблю блакітныя азёры…*
*Другой няма такой зямлі!*

*І людзі тут з адкрытым сэрцам,*
*Завуць гасцінна ў свой дом,*
*Там шчодра ўсіх яны накормяць,*
*Сагрэюць вас сваім цяплом.*

*Культура наша мнагранна,*
*Гісторыя вельмі гуманна,*
*Усё тут проста, люба мне,*
*Мой край, удзячны я табе!*

*Удзячны за твае прасторы,*
*Удзячны я табе за зоры,*
*Удзячны я за дом сагрэты,*
*Удзячны за Радзіму гэту!*

*Хачу данесці ўсім на свеце:*
*-Шчаслівы я ў Беларусі!*
*Сваёй краінай, родным краем,*
*Я вельмі-вельмі ганаруся!*

*Малыгіна Дзіяна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*"Гімназія № 3 г. Магілёва"*

## Мая Беларусь

Я люблю Беларусь сваю родную,
Для мяне лепш у свеце няма.
Я лічу яе самай прыгожаю
І кажу гэта я нездарма.
Усё вясной расцвітае навокал,
Ах, якая ў садах прыгажосць!
Яблынь цвет і чароўны іх водар –
У прыроды ізноў маладосць!
Улетку жыта красуецца спраўна,
Безліч кветак цвіце на лугах,
Пад нагамі дыван разнатраўя,
Спевы птушак у лясах і барах.

*Быстрова Ілона Аляксееўна,*
*вучаніца VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва"*

## *Маме*

*Белыя рамонкі,*
*Светлую зару*
*З весняю гамонкай*
*Маме падару.*
*З песняй перапёлкі*
*Васількоў збяру,*
*З колерам вясёлкі*
*Маме падару.*
*Падару ёй многа*
*Самых добрых слоў,*
*Падару сваю ёй*
*Веру і любоў.*
*Са сваёй матуляй*
*Я пагавару,*
*Шчасця, маладосці*
*Ёй я падару.*
*Мама самы шчыры,*
*Добры чалавек.*
*Перад мамай мілай*
*Я ў даўгу навек!*

*Красуцкая Ксенія Паўлаўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 19 г. Магілёва”*

## *Любай маме*

*Тваё цяпло адчуў upершыню,*
*Калі ўбачыў гэты свет вачыма.*
*Мамуля, родная, я так цябе люблю!*
*Няма на свеце закаханей сына.*

*З табою разам мы плануем дзень,*
*Адпачываем і працуем разам.*
*Бывае, што на сэрцы хмарны цень,*
*Бывае, сонейка засвеціць часам.*

*Зімой і ўлетку зоркі ззяюць нам,*
*Вясною, увосені вясёлкай фарбы йграюць.*
*Складаю вершы я для мілай мамы сам –*
*Хай ведаюць усе: натхнення дні бываюць!*

*Шануйце, дзеці, любых мам сваіх!*
*Маліцеся за іх душой і сэрцам.*
*Пакуль мы побач - гэта шчасце іх,*
*Ахвярней дабрыні не стрэнеце ў свеце.*

*Ты – мой анёл, маё жыццё, мой боль…*
*І колькі б не прайшло зямных гадоў імкліва*
*Мая матуля! Я заўжды з табой.*
*Бо ты – маёй істоты палавіна.*

*Лісіцын Мікіта Аляксандравіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва"*

## *Сэрцу любы край*

*Шчыры, шчыры,*
*Мілы, мілы,*
*Сэрцу любы край!*
*Да цябе мая дарога*
*Зноў вядзе праз май.*
*Родныя бярозкі і рабіны рай,*
*Душу запалоніць*
*Светлы небакрай.*
*Я па сцежках гэтых,*
*Дзе юнацтва ідзе,*
*Пабягу з табою*
*Рана па расе.*
*Ветліва ўсміхнецца*
*Сонейка з нябёс.*
*Рэхам адгукнецца*
*Наш шчаслівы лёс.*

*Касцючык Ксенія Уладзіміраўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 23 г. Магілёва”*

## *Ціхая песня вясны*

*Ціхая песня вясны*
*Душу маю напаўняе.*
*Бэзу бялюткага сны*
*Звонам сваім парушае.*
*Хвалька рачная бяжыць,*
*Цешыць прасторы, булькоча.*
*Бераг цікуе, глядзіць,*
*Прызнацца ў любові хоча.*
*Пчолка руплiва, старанна*
*Над бэзам лятае, гудзіць.*
*У гняздзечку салоўка спявае,*
*Мелодыя сэрца жывіць.*
*Жоўтыя вочкі рамонкаў*
*Акінулі позіркам свет,*
*Махнулі празрыстым пялёсткам,*
*Пакінулі вабнасці след.*
*Сонейка ў небе смяецца,*
*А смех той шчаслівы, жывы.*
*Хочацца радасць бясконца*
*Людзям планеты дарыць.*
*Ціхая песня вясны*
*Душу маю напаўняе.*
*Бэзу бялюткага сны*
*Звонам сваім парушае.*

*Шамесава Карнелія Яўгеньеўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва”*

## *Радзіма*

*Вельмі я люблю цябе, Радзіма!*
*Дзе б, у якіх краях я б ні бываў,*
*Ты заўсёды снішся мне, Айчына,*
*Спевы птушак і азёрны край.*

*Сняцца сенажаці мне, палеткі,*
*Чую шэлест спелых каласоў,*
*Як жа я сумую па Радзіме,*
*Хочацца хутчэй ужо дамоў.*

*Шмат на свеце месцаў разнастайных,*
*Усе яны прыгожыя, ды ўсё ж*
*Лепш няма за родную старонку,*
*Дзе ў дзяцінстве бегаў басанож*

*Ракіцкі Міхаіл Паўлавіч,*
*вучань VI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 35 г. Магілёва"*

## *Небяспечная хвароба*

*Пачалося ў Кітаі,*
*І, напэўна, не ў маі.*
*Захварэлі людзі ўсе,*
*І не збавіцца нідзе.*

*І ў Маскве, і ў Краснадары,*
*У Магілёве, у Самары,*
*І ў Германіі, і ў Глуску,*
*І, напэўна, у Іркуцку.*

*І не бачны ён зусім,*
*І захварэць лёгка ім.*
*Сядзець ён дома прымушае,*
*Да сяброў хадзіць не дазваляе.*

*Каб ім ніколі не хварэць,*
*Трэба ўсім маску мець.*
*Хто маску не носіць зусім ,*
*Не пусцяць нават у магазін.*

*Цімашкова Тамара Ігараўна,*
*вучаніца V класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 4 г. Магілёва”*

## Зіма

Коўдрай зімовай накрылі
Шлях і палеткі снягі,
Што завірухі пашылі
доўгаю пляскай тугі.
Стынуць старыя ракіты –
Варта рачных берагоў.
З белых тканін-аксамітаў
Вопраткі сонных лугоў.
Села на трон ледавіты
Лютая цётка-зіма.
Ёй валадарства здабыта
Раццю паўночнаю хмар.
Што звар’яцелыя ветры
Гналі з далёкіх краёў
І завярцелі ў паветры
Безліч сняжынак-раёў.
Сцюжай скаваныя рэчкі
Стогнуць пад панцырам льду.
Панівак рэдкіх калечкі
Дораць пітную ваду.
Стынуць лясы ў самоце.
Як тут улетку гуло…
У застарэлай маркоце
Роднае дрэмле сяло.

*Зайцава Вольга Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 7 г. Магілёва”*

## *Радзіме*

*Мая зямля, мая любімая Радзіма!*
*Ты вытрымала ў жахлівыя гады,*
*Калі вайна раптоўна захапіла*
*У свой палон пасёлкі, вёскі, гарады.*
*Падэшвамі цяжкіх фашысцкіх ботаў*
*Было раздаўлена шчаслівае жыццё.*
*За страшнай агароджай вострых дротаў*
*Гучала сэрцаў вельмі слабае біццё.*
*За будучае шчасце і свабоду*
*Узняўся мой народ у няраўны бой.*
*Ішоў упэўнена на амбразуру дзотаў,*
*Не адчуваючы смяротны боль.*
*І стары чалавек, і вельмі юны*
*Фашыстаў гналі з роднае зямлі.*
*Радзіме, маці і свайму народу*
*Ні на хвіліну здрадзіць не змаглі.*
*Каб мы жылі свабодна і шчасліва,*
*Хадзілі ў школу ці ў дзіцячы сад.*
*Каб працавалі мірна і рупліва,*
*Не чулі болей выбуху гармат.*
*Якое шчасце – жыць пад мірным небам,*
*Вучыцца, марыць, верыць і любіць,*
*Узяць у рукі смачны бохан хлеба*
*І продкам за жыццё ўдзячным быць!*

*Долбун Арцём Паўлавіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва”*

## *Зіма прыйшла!*

*Іскрыцца белы снег пушысты,*
*Ён ціха кружыцца, ляціць.*
*Зямля, як дыванок срабрысты,*
*Пад белым покрывам ляжыць.*

*І дрэвы інеем пакрыты,*
*Галінкі весела блішчаць,*
*І гэта нам зусім не сніцца,*
*Зіма прыйшла, хадзем страчаць!*

*Зіма прыйшла, усё так прыгожа!*
*І сонца свеціць у вышыні.*
*Галлём хістаюць ціха лозы,*
*Як чорнай ноччу ліхтары.*

*Зіма прыйшла, і ўсе абшары*
*Абрусам белым паляглі.*
*Зіма прыйшла, і футрам мяккім*
*Пакрыліся палі, лугі.*

*Троцкая Дар'я Русланаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 17 г. Магілёва"*

## *Маім настаўнікам*

*Я бяру кавалак гліны,*
*Пачынаю майстраваць.*
*Атрымаўся чалавечак –*
*Ні прыбавіць, ні адняць.*

*Разважаю, як нялёгка*
*Чалавекаў з нас ляпіць.*
*Добрых, радасных, прыгожых*
*Песціць, навучаць, расціць.*

*Колькі таленту, старання*
*Трэба мець, каб нас вучыць.*
*Не зламаць, не абяскрыліць,*
*Добрымі людзьмі зрабіць.*

*Разважаю – разумею:*
*Майстры ў школе ёсць у нас!*
*Калі я чаго не ўмею,*
*Навучуся я ад Вас.*

*Добры погляд, строгі выгляд*
*І цярпенне ёсць у Вас.*
*І дабра, і разумення*
*Хопіць разам на ўсіх нас.*

*Варапаева Ефрасіння Мікалаеўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 21 г. Магілёва"*

## Зямля Беларусі

*Зямля Беларусі –*
*Святая зямля,*
*Табой ганаруся,*
*Люблю цябе я!*
*І клёкат busліны,*
*І крык журавоў,*
*І чырвань рабіны*
*У нас пад акном,*
*І водар сунічны,*
*І сінь васількоў,*
*І плёскат крынічны,*
*І звон ручаёў.*
*Палі і дубровы,*
*Глыбіні азёр –*
*Няхай і не новы,*
*Ласкавы ўзор.*
*Блакітнае неба,*
*Лугі і лясы.*
*Мне лепшай не трэба*
*Зямлі і красы.*
*Зямля Беларусі –*
*Святая зямля,*
*Табой ганаруся,*
*Люблю цябе я!*

*Красоўская Паліна Арцёмаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва"*

## *Белы снег чысцюткі*

*Белы снег чысцюткі*
*Лёгка рэжуць сані.*
*Едуць сцежкай хутка,*
*А ў іх – мы самі.*

*Конік белы-белы*
*Шпаркаю хадою*
*Нас вязе ў казку,*
*Тую, што з табою.*

*Бачылі ў сне мы,*
*памятаеш, улетку?*
*Дзе з ільду і снегу*
*Зіхацелі кветкі?*

*Дзе зіма-красуня*
*Сустракала ў далях,*
*Танчыла ў вальсе*
*У празрыстым шалі.*

*Едзем, едзем ў госці!*
*Любім мы прыгоды!*
*Мчыся, мчыся, конік!*
*Шчасця! З Новым годам!*

*Станкевіч Яніна Паўлаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва"*

## *Пачуйце мяне, сябры!*

*Адзінства – вось моц наша, сіла!*
*Адзінства! Пачуйце ж, сябры!*
*Ідэя стагоддзямі жыла,*
*Застацца б нам так назаўжды.*

*Ці можна вось так лёгка, браце,*
*Аддаць гэта на забыццё:*
*Народнае наша багацце*
*І мірнае наша жыццё?*

*Нам лёсам падорана дзіва.*
*Гучыць яно, як запавет.*
*У дзяцінстве пачуеш: "Радзіма",*
*Адчуеш пасля ўжо - навек.*

*Вы скажаце: "Гэта не нова…"*
*А трэба, каб новым было*
*Пяшчотнае матчына слова,*
*Над вёскай буслова крыло?*

*Мне змалку да болю знаёмы*
*Тут сцежкі і твары людзей,*
*І роўнага болей такога*
*Кутка не знайду анідзе.*

*Ці лепей – і так можа стацца,*
*Што будзем, абраўшы свой шлях,*
*Да скону вякоў азірацца,*
*У чужых пабірацца краях.*

*Вялікую важнасць адчуйце*
*У сённяшняй гэтай пары.*
*Пачуйце мяне вы, пачуйце*
*І ўсё зразумейце, сябры!*

*Фурсава Марыя Вячаславаўна,*
*вучаніца VIII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 11 г. Магілёва”*

## *Зорка жыцця*

*Чалавек пад пэўнай зоркай*
*Нараджаецца, жыве.*
*І яна, як промень сонца,*
*Усё жыццё яго вядзе.*
*То паказвае  дарогу*
*Да шчаслівага жыцця,*
*То вядзе ў цемру гора,*
*І пакут, і забыцця.*
*Знічкай, нібы вугалёчак,*
*Загараецца сама.*
*І гарыць на небасхіле,*
*Лёс стварае нам яна.*
*Калі зорачка іскрыцца,*
*Як ліхтарык зіхаціць,*
*Значыць, сэрца чалавека*
*Б’ецца, марыць і баліць.*
*А калі яна згасае,*
*Пакідае свой ларэц,*
*Чалавек той памірае:*
*Шлях яго знайшоў канец.*
*Можа, гэта і легенда,*
*І прыдумана яна.*
*Я жадаю, каб усе зоркі*
*Век гарэлі свой штодня.*

*Яновіч Таісія Валер’еўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 23 г. Магілёва”*

## *Зямля святая*

*Люблю старонку гэту,*
*Блакіт нябёс, азёр.*
*Аддзячыць бы планету*
*За дзіўны, спеўны хор.*

*Рамонак у полі чыстым,*
*Званочак ля ракі.*
*Душэўны смех празрысты*
*І сябар гаманкі.*

*Усё маё, жывое.*
*Нікому не аддам.*
*Вясенняю парою*
*Прайдуся сцежкай сам.*

*Успомню холад ночы*
*Далёкай той пары,*
*Калі зямлю жывую*
*Таптаі немчуры.*

*Аднак не ўдалося*
*Захопнікам-звярам.*
*Жаданне не збылося.*
*Героі, дзякуй Вам!*

*Зямля мая святая,*
*Святая, як жыццё.*
*Сваволіць бойка хваля.*
*Якое хараство!*

*Люблю старонку гэту*
*Да скону, назаўжды.*
*Скажу ўсяму я свету:*
*Не будзе больш бяды!*

*Машчынская Анастасія Аляксандраўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 31 г. Магілёва"*

## *Пад мірным небам*

*А хтосьці*
*Падаў апошнім*
*У народжанай цішыні.*
*Перамога*
*Была ўжо побач,*
*І крочыў май па зямлі.*

*А хтосьці*
*Падаў апошнім,*
*І стылі зрэнкі ў вачах.*
*У небе*
*Наш, пераможны,*
*Лунаў над рэйхстагам сцяг.*

*І свет*
*Усклікаў урачыста,*
*Журавы ў небе плылі…*
*А хтосьці*
*Падаў забіты,*
*Вяртаючы мір зямлі…*

*Мартынава Марыя Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 33 г. Магілёва"*

## *Малюнкі позняй восені*

*Змывае колеры асенні дождж,*
*І вецер гоніць лісце ў каляіну,*
*Па даху кроплі стукаюць усю ноч,*
*Ляціць у далёкі край клін жураўліны.*

*Мільгне на небе раптам просінь,*
*І промень сонца заблішчыць і прападзе.*
*Нам не хапае яркіх фарбаў увосень —*
*Усё рыхтуецца к зіме.*

*Матляе вецер голле мокрых дрэў,*
*Даўно ўжо парыжэлыя лугі…*
*Птушыны не чуваць у садах напеў —*
*Асеннія карціны смутку і тугі.*

*Апошнія дні восені сырой,*
*Няма навокал яркае красы…*
*Канчаецца ў прыродзе цыкл чарговы свой,*
*Але ў душы звіняць ужо лета галасы.*

*Шацкая Караліна Дзянісаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 39 г. Магілёва”*

## *Чараўніца зіма*

*Зіма-чараўніца*
*Да нас завітала,*
*У снежныя футры*
*Ўсе дрэвы прыбрала.*
*Сказала мне: “Насця,*
*Канькі даставай,*
*Валёнкі надзень,*
*Кажушок апранай.*
*Я буду марозіць,*
*Вакол усё бяліць,*
*Чароўныя цуды*
*Ўсім дзецям дарыць!”*
*А я прыгажуні*
*Зіме адказала:*
*“Даўно,чараўніца,*
*Цябе я чакала!”*

*Хадунько Вікторыя Дзмітрыеўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“ВПК дзіцячы сад-сярэдняя школа № 42 г. Магілёва”*

## *Калі б не мы…*

*Жыла прырода і спявала,*
*Усё навокал танцавала –*
*Быў цёплы, звонкі месяц май!*
*Але бяда прыйшла ў гай.*

*Бягуць на сход звяры і птушкі,*
*Лятуць чмялі, камарыкі і мушкі…*
*Усіх клічуць, б'юць трывогу,*
*Галосяць моцна, да знямогі.*

*– Бяда! Пажар на ўзлеску!*
*Ён хутка будзе ўжо на пералеску! –*
*Чырыкнуў дрозд. – Мы ўсе загінем!*
*А дзетак на каго пакінем?*

*Тут дзяцел выступіў:*
*– Збірайся, дрозд, і пашукай людзей!*
*Скажы, што дапамога трэба,*
*З табою паляціць і мой калега.*

*– Вы з туканом хутчэй ляціце !*
*Дарогу напраскі знайдзіце.*
*Агонь жа вас чакаць не будзе,*
*Нікога злодзей не забудзе!*

*І паляцелі птушкі да людзей.*
*З сабой панеслі тысячы надзей.*
*Распавядалі сумную гісторыю сваю,*
*Прасілі з плачам адагнаць бяду.*

*І людзі справы ўсе свае адклалі,*
*З сабою шмат вады ўзялі,*
*Змагаліся з агнём яны без жаху,*
*І ўцёк злачынца той ад страху.*

*Зноў ажыла прырода, заспявала,*
*Навокал зноў усё затанцавала.*
*І сонейка з-за хмары засвяціла,*
*Звяроў і птушак шчасцем адарыла!*

*Маменчыкаў Дзяніс Міхайлавіч,*
*вучань VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 8 г. Магілёва”*

## *Зварот да ветэранаў*

*Дарагія мае ветэраны,*
*Вас так мала на гэтай зямлі.*
*Кожны з Вас для нас паважаны,*
*У нашай памяці Вы – назаўжды!*

*Колькі год бачым мірнае неба,*
*Колькі часу не ведаем страху!*
*І хапае навокал ўсім хлеба,*
*І жывуць людзі добра, з размахам…*

*Кожны год мы збіраемся ў маі,*
*Каб сказаць: “Вялікі Вам дзякуй,*
*Што жывём ў незалежным мы краі*
*І пад нашым дзяржаўным сцягам!”*

*Дарагія мае ветэраны,*
*Вы героі жахлівай вайны.*
*Кожны з Вас для нас паважаны,*
*Наш паклон Вам да самай Зямлі!*

*Качанава Ніколь Міхайлаўна,*
*вучаніца VII класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 43 г. Магілёва”*

## *Роздум*

*Ты мне кажаш пра лёс,*
*Што, як быццам, нам дадзены зверху.*
*Я не веру, няпраўда,*
*Ты зверху яго не чакай.*
*Кожны сам выбірае, як жыць:*
*Ці ў слязах, ці са смехам,*
*Ці цягнуць сваю лямку,*
*Ці ўласны стварыць сабе рай.*
*Намі толькі кіруюць*
*Ці прага, ці наша жаданне.*
*Прага вечнага шчасця,*
*Жаданне бясконца любіць.*
*Пэўна знаю адно:*
*У жыцці сапраўды ёсць каханне.*
*Без яго немагчыма,*
*Яно прымушае нас жыць.*

*Навічонак Мілена Уладзіміраўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 1 г. Магілёва"*

## *Простае падарожжа*

*О Беларусь, твая прырода –*
*зямлі бацькоў адбітак гожы!*
*Складаю прыгажосці оду*
*І запрашаю ў падарожжа.*
*Ідзеш пад сонейкам па вёсцы…*
*За рэчкаю – зялёны бор.*
*Прайдзі далей – і ты ўбачыш*
*На ўзлессі бэзавы чабор.*
*Над галавою – белы бусел,*
*Абараняе ён край мой!*
*Жыву я тут і ганаруся*
*Славутаю сваёй зямлёй!*
*Валошкі, макі і рамонкі…*
*Збяру іх разам – ды ў вянок!*
*Прайдуся ў полі ранкам звонкім,*
*Дадам пшанічны каласок…*
*Калі вандрую я далёка,*
*Дадому я заўсёды рвуся.*
*Прырода болей цешыць вока*
*У мілай сэрцу Беларусі.*

*Нікіценка Ксенія Дзянісаўна,*
*вучаніца ІХ класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Гімназія № 3 г. Магілёва”*

## *Восеньскі цуд*

*Восень-сястрычка, ты хутка прыйшла,*
*Холад і дожджык з сабой прывяла.*
*Вільгаць, туманы – у душы неспакой…*
*Ты не спяшайся змяніць мой настрой!*
*Дай наглядзецца на восеньскі цуд,*
*Дай жа агледзець родны свой кут.*
*Поле, лясы, як блакіт, небакрай.*
*Рознымі фарбамі, восень, зайграй!*
*Клён за акном задуменны стаіць,*
*Думае думу, штосьці маўчыць.*
*Сумна, тужліва на лісце глядзіць,*
*Як яно хутка з ветрам ляціць.*
*Золатам сыпле лісце на дол,*
*Просіць у сцежак на месца дазвол:*
*“Можна вас, сцежкі, коўдрай накрыць?*
*Людзям прыемней будзе хадзіць!”*
*Чырвонае, жоўтае, вельмі агністае*
*Лісцейка рознае, ад дожджыку чыстае.*
*Барвовая, яркая, лісцем багатая,*
*Радуе вока сцежка стракатая.*
*Людзі здзіўляюцца з гэтага цуду*
*І адганяюць асеннюю смуту.*
*Восень любімая, восень чаканая!*
*Радуй усіх, чараўніца жаданая!*

*Волкава Ганна Юр’еўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 46 г. Магілёва”*

## *Мая Радзіма*

*Мая любімая Радзіма,*
*Азёрны край, бусліны дом.*
*Птушыных спеваў пералівы,*
*Сям'я бярозак над Дняпром.*

*У лесе спелыя суніцы,*
*У палях зярнятак перазвон.*
*У барах сасновых пах іглiцы,*
*Грыбы склікаюць на паклон.*

*Узімку – снежныя сумёты,*
*Улетку – зорны небакрай,*
*Увосень – дываны лістоты,*
*Увесну – зяляніны рай.*

*Азёры, рэчачкі, крынічкі –*
*Вады празрыстай светлы звон.*
*А жаўтагрудыя сінічкі*
*Сяброўак клічуць за акном.*

*Мая зялёная Радзіма,*
*Край гордых птушак і зуброў,*
*Край, сэрцу дарагі і мілы,*
*Мая надзея і любоў!*

*Юрчанка Валерыя Сяргееўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 27 г. Магілёва"*

## *Якое шчасце – проста жыць…*

*Мы, беларусы – мірныя людзі,*
*Сэрцам адданыя роднай зямлі…*

*Якое шчасце – проста жыць*
*І прачынацца на світанні,*
*Цяпло ўсмешкі ўсім дарыць*
*І радасць першага спаткання.*
*Спаткання з сонцам і зямлёй,*
*З дзівосным светам прыгажосці*
*Радзімы светлай, дарагой.*
*Дзе няма зайздрасці і злосці!*
*Якая асалода – жыць*
*У міры ў бязмежным свеце,*
*Дзе ёсць магчымасць усім тварыць*
*І дзе смяюцца шчыра дзеці!*
*Дзе людзі ў душы нясуць*
*Спагаду, ласку, міласэрнасць*
*І да святла ў рай ідуць*
*Праз вечную любоў і вернасць!*

*Сяргутка Уладзіслаў Сяргеевіч,*
*вучань Х класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 18 г. Магілёва"*

## *Адчуванне шчасце*

*Зіхацяць каралі на краі ўзлеска…*
*Вецер лашчыць хмары ў сінім паднябессі…*
*Засакоча птушка…Як тут здагадацца?*
*Дзе знайсці, дзе стрэнуць адчуванне шчасця?*

*Раніцай празрыстай ушануе сэрца*
*Новы дзень квяцісты – хай ён застанецца!*
*У вершах, песнях, думках, у малюнках светлых,*
*У водары падзеі, у вясны прыкметах.*

*Усё наўкол гаворыць – ты ўмей паслухаць.*
*І жыццё з бядою – добрая навука.*
*Зразумей другога, спачувай, углядзіся!*
*Адчуванне шчасця назбірай пакрысе.*

*Не шануй самоту, не шукай спакою.*
*Час бяжыць імкліва – ты яго напоўні*
*Справамі зямнымі, дабрынёй, спагадай,*
*Клопатам, даверам, розумам і праўдай.*

*Побач усё жывое шмат не разважае:*
*Існуе як сутнасць Божага ўраджаю.*
*Подыхам паветра цешыцца прырода.*
*Адчуванне шчасця… У нас яно – ад Бога.*

*Зарэмская Аляксандра Уладзіміраўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 33 г. Магілёва”*

## *Вярнуся на Радзіму я*

*З краін далёкіх, па чыгунцы,*
*Вяртаюся ў родны край.*
*Томік Шамякіна ў сумцы,*
*У сэрцы непаўторны май.*
*Душа ные ў прадчуванні*
*Сустрэчы з роднай стараной,*
*У думках – шчырае спатканне*
*З маёю любаю сям'ёй.*
*Ну а пакуль, пад грукат колаў,*
*Нясецца шэраг успамін:*
*Гняздо бусла, лёс роднай мовы,*
*Славутасць велічных мясцін.*
*Як я люблю цябе, Радзіма!*
*Як ганаруся я табой!*
*Зямля славутых Радзівілаў,*
*Кліч Каліноўскага: "За мной!"*
*За думкай час хутчэй бяжыць…*
*Ужо бачу любы краявід.*
*Як добра на Радзіме жыць,*
*А на чужыне ты – прывід.*
*Самоты час мяне пакінуў,*
*Ужо ў абдымках уся сям'я…*
*Куды б мой лёс мяне не кінуў,*
*Вярнуся на Радзіму я.*

*Мухіна Анастасія Сяргееўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 9 г. Магілёва"*

## *Праведайце маці*

*Маці чакае гасцей,*
*Зранку глядзіць з-пад рукі.*
*Вы прыязджайце часцей,*
*Родныя дочкі, сынкі.*

*Стамілася маці чакаць,*
*Мокры хусцінкі ражок.*
*Ёй бы крывінак абняць*
*Ды пасуліць піражок.*

*З зёлак гарбаты наліць*
*Ды распытаць пра жыццё.*
*Сэрца матулі баліць –*
*Што ж вы так доўга ідзяце?*

*Ці так засмечаны шлях?*
*Не, мы ж жывём не ў тайзе.*
*Помніце, як на руках*
*Маці нясе нас, нясе.*

*Час вельмі хутка бяжыць,*
*Як халадок ад ракі.*
*З’ездзі! Матуля стаіць,*
*Гледзячы ўдаль з-пад рукі*

*Лабанава Ганна Уладзіміраўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 40 г. Магілёва”*

## *Ночка Купальская*

*Ночка Купальская мне падабаецца,*
*Дзіўная вельмі яна!*
*Зорка на небе мігціць-усміхаецца,*
*Нам пажадае дабра!*

*Вось карагоды дзяўчат набліжаюцца,*
*Радасна песні звіняць…*
*Хай усё збываецца, што загадаецца,*
*Пойдзем мы шчасце шукаць!*

*Папараць-кветка чакае, хвалюецца,*
*Цягне пялёсткі свае…*
*Са светлячкамі спявае-мілуецца…*
*Казка… Як быццам у сне!..*

*Хвалькі ў возеры светла-празрыстыя*
*Так зіхатліва дрыжаць.*
*Кропелькі чыстыя і прамяністыя*
*Будуць на мары натхняць!*

*Ночка Купальская мне падабаецца,*
*Дзіўная вельмі яна!*
*Кветкі-праменьчыкі пераліваюцца,*
*Быццам вясёлка жыцця!*

*Гур'янава Віта Валянцінаўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя школа № 15 г. Магілёва"*

## *Усмешка*

*Усміхайцеся заўсёды,*
*Усміхайцеся заўжды.*
*Калі нават і  нягоды*
*Напаткалі ў жыцці.*
*Усміхайцеся знаёмым,*
*Усміхайцеся сябрам.*
*І  аднойчы пакрыёма*
*Усміхнецца хтосьці  вам.*
*Усміхнуўшыся, сагрэе*
*Сэрца ваша тым святлом.*
*Што іскрыцца ды ірдзее.*
*Нібы зорка за акном.*
*Вас усмешка падтрымае*
*У няпросты жыцця  час.*
*Прыгалубіць, супакоіць,*
*Вытра слёзы на вачах.*
*І ўзніме над зямлёю.*
*Крылы дасць вам  і палёт.*
*Толькі  ўмей дзяліцца ёю*
*З дня ў дзень і з году ў год.*
*Не шкадуй усмешкі людзям.*
*Няхай кажуць: ”Пустасмех!”*
*Усміхаецца шчаслівы,*
*А шчаслівым быць не грэх.*

*Казакова Ангеліна Дзмітрыеўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 17 г. Магілёва”*

## *Жыццё – гульня, цікавая вандроўка*

*Жыццё – гульня,*
*Гуляй разумна.*
*І памятай чаго дзеля,*
*Калі бывае вельмі сумна,*
*Ты ўспамінай, яна адна.*
*Бываюць узлёты і падзенні,*
*Хвіліны сумныя, цяжар.*
*Зганяй хутчэй ты ліхалецце,*
*Тушы ў душы сваёй пажар.*
*Жыві, каб задавальняла,*
*Удыхай прыроды водар і жыцця.*
*Каб усё табе ў жыцці спрыяла,*
*Ты памятай чаго дзеля.*
*Жыццё – цікавая вандроўка,*
*Шмат шчасця зможаш ты спаткаць.*
*Ступай ты па зямельцы бойка,*
*Не забывай сваё трымаць.*
*Яно паможа, дасць парады,*
*Ты толькі зразумей той знак.*
*Жыві без зайдрасці, пагарды,*
*Тваё жыццё – найлепшы скарб.*

*Галыга Валерыя Сяргееўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 45 г. Магілёва”*

## *Успамін пра першае каханне*
## *(санет)*

*Памятаю нашу першую сустрэчу,*
*А з ёю шчасце, а таксама боль.*
*Ляціць жыццё, а час не зусім лечыць,*
*І засталася нам ад слёзаў толькі соль.*

*Ніколі не забыць мне наша ўсё,*
*Аднойчы я змагу пра нас табе сказаць.*
*І ўжо тады, магчыма, зменіцца жыццё,*
*Калі мне верыць і адной чакаць.*

*А памятаеш нашыя шчаслівыя імгненні?*
*Хто побач быў, калі ты быў адзін?*
*А памятаеш нашы лепшыя памкненні?*

*Не заўважылі мы тады і бег гадзін!*
*Не памятаеш ты і нават не чакаеш:*
*Енк нашых сэрцаў ты ў сабе трымаеш.*

*Казлова Паліна Аляксандраўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі*
*“Магілёўская гарадская гімназія № 1”*

## *Галоўны скарб жыцця*

*Напрыканцы жыцця я разумею,*
*Што скарб – не золата, не грошы,*
*Што скарб мой той, хто ў холадзе сагрэе,*
*І той, хто на бяду маю не плюшчыць вочы.*

*І з цягам часу больш я прыкмячаў:*
*З жыццём мы ўсе духоўна пасталелі.*
*І той, хто золата сабе жадаў,*
*І тыя, хто дабра не разумелі.*

*З гадамі і, канешне, толькі з імі,*
*І я на навакольны свет глядзеў,*
*Людзей "гнілых" лічыў "святымі"*
*І не цаніў дабра таго, што меў.*

*Напрыканцы жыцця я зразумеў,*
*Што скарб – не золата, не грошы,*
*Што скарб мой той, хто ў холадзе сагрэў,*
*Хто на бяду маю не плюшчыў вочы.*

*Ластаўкін Дзяніс Уладзіміравіч,*
*вучань XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 8 г. Магілёва"*

## *Дзівосны шлях*

*Поры года – як гэта таемна!*
*Калі Зюзя на крылах ляціць,*
*Калі зранку завея-гарэза*
*Крамяністым настроем звініць.*

*Калі пухкія шалікі-гурбы*
*Спавіваюць хваінак рады,*
*Калі чыстыя, светлыя песні*
*Напяваюць марозы ў душы.*

*Поры года – як гэта прыгожа!*
*Калі ластаўка кліча вясну,*
*Калі сціплая кветка пралеска*
*Усміхаецца юнаму дню.*

*Калі першы лісточак-сыночак*
*Раптам мкнецца насустрач цяплу,*
*А шпачок сарамліва-вясёлы*
*Саграває любоўю сям'ю.*

*Поры года – як гэта ўлюбёна!*
*Калі лецейка лашчыць шчаку*
*Ды цалуюцца з кветкамі пчолы,*
*Заліваючы шчасцем зямлю.*

*Калі пах чабаровы ўтрапёна*
*Кружыць галаў задзіру чмялю,*
*Калі ветрык-пястун на арэлях*
*Ціха гушкае радасць маю.*

*Поры года – як гэта святочна!*
*Калі танчыць лістота з зямлёй*
*І самлелыя шэпчуць нябёсы:*
*“Ах, якая пяшчота вакол!”*

*Поры года – як гэта чароўна!*
*Мне па сэрцы дзівосны ваш шлях.*
*Я за вамі іду, не спынюся,*
*Бо наперадзе жыцця прасцяг!*

*Маісеева Аліна Леанідаўна,*
*вучаніца XI класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя*
*школа № 31 г. Магілёва”*

## *Выходжу на вуліцу*

*Выходжу на вуліцу - час на змярканне,*
*На неба гляджу: бачу зорачак ззянне.*
*І позірк блукае па чорнай прасторы,*
*І срэбрам у ім рассыпаюцца зоры.*

*І ў кожнай схавана свая таямніца,*
*І кожная вабіць, нібы чараўніца.*
*Маўклівае ззянне размовай здаецца,*
*То шэпча, то штосьці пяе, то смяецца.*

*І хоць зразумець не магу я размовы,*
*У сэрцы свае нараджаюцца словы.*
*Плывуць мае думкі па чорнай прасторы...*
*Магчыма, вось так нараджаюцца зоры.*

*Несцяровіч Дар'я Аляксандраўна,*
*вучаніца IX класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі "Сярэдняя*
*школа № 32 г. Магілёва"*

## *Матулечцы роднай*

*Маці, матулечка родная!*
*Мне без цябе аніводнага*
*Дня не пражыць і ні ночанькі,*
*Тваёй радзімай дочачцы.*
*Удзячна я за ласку ды пяшчоту,*
*За кепачку ў летнюю спякоту,*
*За кофту цёплую ў сцюжу,*
*За чаравічкі, каб скакаць па лужах,*
*За слова добрае ў дарогу,*
*Ды за параду, дапамогу,*
*Каб годнаю асобаю расці,*
*Упэўненымі крокамі ісці…*
*Сонейка ты маё яснае,*
*Абярэг ты мой уласны,*
*Побач ты ў дні майго шчасця,*
*Сабой захінаеш у нянасце.*
*Рукі твае – наймякчэйшыя,*
*А вочы – найпрыгажэйшыя,*
*Кучарыкі вецер кранае,*
*Табе маё сэрца спявае.*
*Здароўе жадае, пашаны, жыцця шмат гадоў,*
*Любві ад дзяцей, ад людзей – цёплых слоў,*
*Будзь ты заўсёды шчаслівая,*
*Матулечка родная, мілая!*

*Клімава Валерыя Вітальеўна,*
*вучаніца X класа*
*дзяржаўнай установы адукацыі “Сярэдняя школа № 40 г. Магілёва”*